КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 35 (258) ◂ 23 верасня ◂ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час



**ВАЛЯНЦІН СТЭФАНОВІЧ**

Стар. 6

**ПЫТАННІ ТОЛЬКІ ПАМНАЖАЮЦЦА**

Ужо тыдзень ідзе судовы працэс над абвінавачваемымі па справе аб выбуху ў мінскім метро ў красавіку гэтага года. І чым далей, тым больш пытанняў, а не адказаў

Стар. 4

**СТРАЙК У ПУСТЫНІ**

У Казахстане — самая вялікая забастоўка ў нацыянальнай гісторыі. Пачынаючы з мая бастуюць нафтавікі Мангышлаку

Стар. 12

**СВЕТ ЗАХАПЛЕННЯЎ СЯМ'І КАЎРЫГАЎ**

Стар. 15

ISSN 2218-2144
9 772218 214401 10035

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**У КОЖНАГА СВАЯ РЭАЛЬНАСЦЬ**

Нарыс Сяргея Нікалюка з цыклу «Азбука паліталогіі»

▸ **З НАГОДЫ**

# NOTHING PERSONAL, ONLY BUSINESS

Вольга ХВОІН

**Афіцыйны Мінск і Брусэль адмаўляюцца публічна прызнаваць, што пачаўся новы этап гандлю — фінансавая падтрымка ў абмен на свабоду палітвязняў. А само слова «гандаль» нене, ды і праслізгвае ў мове высокіх чыноў.**




У Беларусі распачала сваю місію пасол, кіраўнік прадстаўніцтва Еўрапейскага саюза ў Беларусі Майра Мора. Ужо першая сустрэча дыпламата з Аляксандрам Лукашэнкам паказала, у якім рэчышчы ёй давядзецца працаваць бліжэйшым часам. Прымаючы даверчыя граматы пасла, Лукашэнка выказаў надзею, што «яе багаты досвед работы на дыпламатычнай службе ў суседняй, не чужой для нас Латвіі дазволіць заняць актыўную пазіцыю ў справе развіцця беларуска-еўрапейскіх адносін, забяспечыць іх перазагрузку на прынцыпах раўнапраўя і ўзаемапавагі». Пасля цырымоніі ўручэння даверчых грамат, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Спадзяюся, вы разумееце нас, і гэта вельмі добра. Вы не верце таму, што кажуць і пішуць, што мы з кімсьці будзем гандлявацца так званымі палітвязнямі. Мы ні з кім не гандлюемся. Калі мы можам нешта зрабіць для палягчэння іх долі, у тым ліку ў інтарэсах Еўрасаюза, то не ўтойваем — гэта зробім, і зробім гэта шчыра».

Спадарыня Мора як сапраўдны дыпламат цвёрда паўтарае, што ніякай размовы пра гандаль людзьмі не вядзецца, а «вызваленне і рэабілітацыя палітвязняў — перадумова для аднаўлення дыялогу». «Мая акрэдытацыя прыйшлася на час вельмі крытычнага моманту ў нашых адносінах», — заявіла кіраўнік прадстаўніцтва ЕС у Беларусі Майра Мора. Аднак «ЕС гатовы адкрыць новую старонку ў адносінах з Беларуссю, калі абставіны гэта дазволяць». Спадарыня Мора запэўнівае: «Пытанні эканамічнай дапамогі Беларусі і вызвалення палітвязняў ніякім чынам не звязаныя. Але вызваленне і рэабілітацыя ўсіх палітвязняў — гэта папярэдняя ўмова ўсіх перамоваў». Пасол адзначыла, што ЕС мае важныя эканамічныя інтарэсы ў Беларусі: «ЕС — гэта самы вялікі сусветны рынак. Ёсць цікавасць у тым, каб транзіт энергіі і транспарту праходзіў праз Беларусь без перашкод». Але Еўрасаюз чакае ад Беларусі «рашучых крокаў па шляху прыватызацыі і адкрыццю сваёй эканомікі, што «дапаможа прыцягнуць тэхналогіі і прамыя замежныя інвестыцыі».

Таксама кіраўнік прадстаўніцтва Еўрапейскага саюза ў Беларусі адзначыла, што, нягледзячы на праблемы ў адносінах, Еўрасаюз цалкам не згортваў супрацоўніцтва з Беларуссю. «Беларусь застаецца ўдзельніцай Усходняга партнёрства. Мы запланавалі шэраг тэхнічных дыялогаў, усё яшчэ чакаем адказу на нашу прапанову аб заключэнні пагаднення аб рэадмісіі. Еўрасаюз працягне падтрымку грамадзянскай супольнасці і рэалізацыю праектаў у сферы энергетыкі, харчовай і экалагічнай бяспекі, атамнай бяспекі, а таксама падтрымку СМІ», — патлумачыла дэталі Майра Мора.

На пытанне журналістаў, ці азначаюць апошнія падзеі, што ЕС гатовы ў чарговы раз падмануць сам сябе ў сваёй веры Лукашэнку, Мора сказала: «Мы спадзяемся, што гандлю не адбываецца. А падзеі ў верасні (вызваленне асуджаных па справе «19 снежня») даюць аптымізм Еўрасаюзу. Ёсць падставы думаць, што астатнія палітвязні змогуць выйсці на свабоду».

Гандаль ці «гуманныя прынцыпы»? З пачатку жніўня на свабоду тройчы выпускалі палітвязняў. Гэтымі днямі ў ЗША праходзіць штогадовы сход кіраўнікоў МВФ і Сусветнага банка. Група беларускіх чыноўнікаў якраз на гэтыя дні накіравалася ў Вашынгтон. Планавалася, што дэлегацыю ўзначаліць Надзея Ермакова, але яна засталася ў Мінску. Па словах прэс-сакратара МЗС, з-за таго, што віза старшыні праўлення Нацбанка была выдадзена са спазненнем.

У Вашынгтоне зараз міністр фінансаў і міністр эканомікі нашай краіны. МВФ нядаўна адмовіў Беларусі ў выдачы крэдыту, але ўрад і Нацбанк Беларусі ўсё ж разлічваюць на новую крэдытную праграму.

Аляксандр Лукашэнка тым часам запэўнівае, што страхі з нагоды эканамічных цяжкасцяў ужо не мусяць мець месца. «Паверце, мы не знаходзімся ў такой сітуацыі, калі нам трэба кудысьці бегчы, на калені падаць, — заявіў кіраўнік дзяржавы. — І першыя дні, калі мы пайшлі на рэзкую нармалізацыю валютнай сітуацыі, паказалі, што крызісу ў нас таго не было. Нам цяпер трэба клапаціцца, каб курс нашай валюты рэзка не зваліўся, блізка да таго, як ён быў, а ён да таму імкнецца». Пры гэтым Лукашэнка адзначыў: «Мы без чыёй бы тое ні было дапамогі выкараскаліся з гэтай сітуацыі». Аднак гэта не азначае, што Беларусь супраць таго, каб узяць мільярдзік-другі ў сваіх новых ці старых сяброў. Напрыклад, урад Кітая прыняў рашэнне аб выдзяленні Беларусі льготнага крэдыту ў 1 мільярд долараў ЗША для рэалізацыі сумесных узгодненых праектаў. А 70 мільёнаў юаняў будзе выдзелена ў якасці бязвыплатнага гранта — кітайскі атракцыён шчодрасці. Ды і міністр эканомікі Беларусі Мікалай Снапкоў мяркуе, што варта працягваць перамовы з МВФ аб выдзяленні новага крэдыту для Беларусі, «хоць крэдыт і не крытычны».

УЗНАГАРОДА

# ЛОБАТАМІЯ ХАШЧАВАЦКАГА

**Дакументальны фільм «Лобатамія», зняты Юрыем Хашчавацкім, двойчы ўганаравалі на XXI Міжнародным кінафестывалі «Arsenals» у Рызе.**

Імпрэза праходзіла 10–18 верасня. У катэгорыі дакументальных фільмаў змагаліся 26 стужак. Фільм паводле сцэнара і ў рэжысуры выбітнага беларускага дакументаліста Юрыя Хашчавацкага ўзнагародзілі двума прызамі: «за найлепшы балтыйскі фільм» і спецыяльнай узнагародаю фірмы «Nikon».

«Лобатамія» паказвае жахлівую палітыку «братняй краіны» ў дачыненні сваіх суседзяў. На прыкладзе гучных канфліктаў апошніх гадоў, між іншага, расійска-грузінскай вайны, аўтар паказвае, што ў сучасным свеце скальпель у руках хірурга замянілі сродкі масавай інфармацыі, а ў ролі псіхіятраў выступаюць палітыкі.

«Лобатамія» — гэта ўнікальныя кадры расійска-грузінскага канфлікту 2008 года, якія аўтар атрымаў з МЗС Грузіі. Такою жнівеньская вайна засталася ў памяці грузінскага народу. Аўтар супастаўляе гэтыя здымкі з тым, што бачылі на экранах сваіх тэлевізараў гледачы ў Расіі. У стужцы Хашчавацкі спрабуе зразумець, чаму жыхары постсавецкіх краінаў гэтак лёгка паддаюцца маніпуляцыям з боку медыяў.

Найменне фільму паходзіць ад назвы нейрахірургічнай аперацыі, падчас якой разразаюць нервовыя валокны, што лучаць лобныя долі мозгу са структурамі прамежкавага мозгу. Яе мэта — зменшыць эмацыйныя працэсы, якімі звычайна суправаджаюцца думанне і ўзгадванне. Адзін з асноўных пабочных эфектаў лобатаміі — пацыент губляе пачуццё, што ён той самы чалавек, якім быў учора і будзе заўтра.

Дакументальная стужка «Лобатамія» паўстала ў 2010 годзе ў супрацы чатырох партнёраў: «Baltic Film Production» (Эстонія), «Free Pro Video Institute» (Германія), «Bramafilm» (Беларусь) і тэлеканалу «Белсат» пры падтрыманні «Jan Vrijman Foundation» і «Open Estonia Foundation».

Раней гэты дакументальны фільм ўганаравалі на кінафестывалі «Cronograf» у Кішынёве, і таксама двума прызамі. У малдаўскай сталіцы «Лобатамія» атрымала прыз глядацкіх сімпатыяў і спецыяльную ўзнагароду журы за «экспрэсіўнасць аўтара і ягонае грамадзянскае сумленне».

**Паводле Белсат ТВ**

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# ПАЛІТВЯЗНЯЎ ПЕРАВОДЗЯЦЬ

**Генадзь КЕСНЕР**

**Былога кандыдата ў прэзідэнты Беларусі Андрэя Саннікава этапавалі з Наваполацкай калоніі ў папраўчую калонію № 2 у горадзе Бабруйску.**

Пра гэта журналістам паведаміла жонка палітвязня Ірына Халіп, якая надоечы атрымала адпаведную тэлеграму. З Горацкай калоніі вывезлі лідара зарэгістраванага ў Чэхіі «Маладога фронту» Змітра Дашкевіча.

Як адзначыла Ірына Халіп у інтэрв'ю сайту charter97.org, перавод у іншую папраўчую ўстанову ёсць спробаю націснуць на Андрэя Саннікава. «У Наваполацкай калоніі ён карыстаўся аўтарытэтам у зняволеных, а адміністрацыя адмаўлялася яго «прэсаваць» наконт памілавання — да яго нават ніводнага разу з гэтым не звярталіся... Гэта сведчыць пра тое, што Андрэя Саннікава ніхто не збіраецца вызваляць, і ўсе гэтыя абяцанні — не больш як чарговая спроба ўвесці ўвесь свет у зман. Калі б кандыдата ў прэзідэнты збіраліся вызваляць, то ніхто яго не пераводзіў бы ў іншую калонію», — падкрэсліла Ірына Халіп.

Тым часам, стала вядома, што ў іншую папраўчую ўстанову пераводзяць і Змітра Дашкевіча, які дагэтуль знаходзіўся ў Горацкай калоніі. Пра гэта намесніца старшыні «Маладога фронту» Анастасіі Палажанцы паведаміла адвакат Дашкевіча. У аўторак з'явілася інфармацыя, што зараз палітык знаходзіцца ў следчым ізалятары Магілёва, а пасля будзе адпраўлены ў іншую калонію.

Як лічыць адвакат Дашкевіча, гэта ёсць рэакцыя на шматлікія скаргі вязня на катаванні з боку адміністрацыі Горацкай ПК–9. 20 верасня стала вядома, што Змітру Дашкевічу адмоўлена ў пераводзе на «хімію» у сувязі з адбыццём трацінны тэрміну пакарання.

ПАМЯЦЬ

# РАЗВІТАННЕ З ГАЛІНАЙ СЯМДЗЯНАВАЙ

**Генадзь КЕСНЕР**

**20 верасня на Паўночных могілках непадалёк ад беларускай сталіцы пахавалі Галіну Сямдзянаву — вядомага беларускага палітыка, экс-дэпутата фракцыі БНФ у Вярхоўным Савеце Беларусі 12-га склікання.**



Развітанне з Галінай Георгіеўнай, якая пайшла з жыцця пасля цяжкой хваробы на 65-м годзе, адбывалася ў рытуальнай зале спецкамбіната КБА на вуліцы Альшэўскага, 12. Аддаць апошнюю даніну памяці гэтай знанай і мужнай жанчыне прыйшлі яе калегі па парламенту Валянцін Голубеў, Станіслаў Шушкевіч, Лявон Баршчэўскі, Лявон Дзейка, Пётра Садоўскі, Юрась Беленькі, Сяргей Папкоў, Аляксандр Сасноў, Сяргей Антончык, Іосіф Сярэдзіч, Алег Трусаў, іншыя палітыкі, грамадскія дзеячы і проста тыя, хто ведаў Галіну Сямдзянаву, хай нават і не асабіста.

На грамадзянскай паніхідзе Галіну Сямдзянаву ўзгадвалі вельмі цёпла. «Яна была вельмі светлым, добрым, разумным чалавекам, — сказаў Валянцін Голубеў. — Я вось зараз успамінаю, як яна ўмела паказаць сябе зале, калі яна прыходзіла на чарговую сесію, з новай прычоскай... Ёю ўсе захапляліся — і апазіцыя, і нашы апаненты. А яна выходзіла, вось такая дама, для балю, для прыёму, а яна выходзіла на трыбуну і змагалася, змагалася за Беларусь, за незалежнасць, дэмакратыю. Ведаючы тое, што сама яна ўкраінка, і тое, што лёс яе вельмі позна звязаў з Беларуссю, яшчэ больш дзякуй, Галя, табе за гэта, што ты прыйшла да нас і што ты змагалася за нашу незалежнасць».

Па словах сябра Беларускай партыі левых «Справядлівы свет», сяброўкі нябожчыцы Алены Скрыган, Галіна Сямдзянава прыцягвала да сябе людзей зусім розных, нават супрацьлеглых палітычных поглядаў. «Я ведаю, як яна ўмела працаваць, як яна магла працаваць цэлую ноч, а заўтра раніцай пачынаць зноў, як быццам бы нічога не было. І яна была вельмі добрым сябрам, не толькі магла паспачуваць, а адразу кідалася дапамагаць», — адзначыла Алена Скрыган.

Выступоўцы ўспаміналі, што Галіна Георгіеўна прыйшла ў парламент, калі займала пасаду кіраўніка Камітэта народнага кантролю ў Навагрудку. Тым больш фенаменальным было тое, што Сямдзянава стала сябрам фракцыі Беларускага народнага фронту, адным з самых яскравых апазіцыйных дэпутатаў легендарнага Вярхоўнага Савета 12-га склікання. Менавіта Сямдзянава ўнесла ў парламенцкую залу бел-чырвона-белы сцяг, які стаў дзяржаўным дзякуючы высілкам перш за ўсё дэпутатаў фракцыі БНФ. Згадвалася і пра тое, як Галіна Георгіеўна літаральна не дала выступіць на сесіі тагачаснаму кіраўніку ЦК КПБ Малафееву — сёння той ужо гістарычны здымак месціцца ў Музеі Салідарнасці ў польскім Гданьску.

Ужо на Паўночных могілках Юрась Беленькі зачытаў жалобнае пасланне былога лідара фракцыі БНФ у ВС, цяперашняга старшыні Кансерватыўна-хрысціянскай партыі — БНФ Зянона Пазняка. Прысутныя праводзілі Галіну Сямдзянаву ў апошні шлях спевам гімна «Магутны Божа». Пахаваная Галіна Георгіеўна побач з яшчэ двума вядомымі беларусамі — Уладзімірам Конанам і Віталем Скалабанам.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ПОЛЬСКІ БОК АБРАЗІЎСЯ

**Пасол Польшчы ў Беларусі Лешак Шарэпка абверг матэрыял Беларускага тэлебачання на тэму нацыянальных меншасцяў. Спадар Шарэпка заявіў, што звычайна каментаваць сюжэты БТ не прынята, але гэтым разам была закранутая «адчувальная тэма нацыянальнай меншасці».**

Нагодай для заявы па нацыянальных меншасцях стаў сюжэт, што быў паказаны ў праграме «У цэнтры ўвагі» па Першым канале Беларускага тэлебачання. У гэтым сюжэце закранался тэма беларускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы, гаварылася аб пераносе беларускага культурнага цэнтра з Беластока ў Варшаву. Пасол Польшчы ў Беларусі Лешак Шарэпка запэўніў, што правы беларускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы не парушаюцца.

Лешак Шарэпка паведаміў, што Беларусь і Польшча правялі шэраг кансультацый па пытанні статусу і далейшага лёсу Польскага інстытута ў Мінску і Беларускага культурнага цэнтра ў Польшчы. Ужо распрацаваны праект пагаднення і, верагодна, да канца года яно будзе падпісанае. Разам з тым спадар Шарэпка мяркуе, што падтрымка нацыянальных меншасцяў у Польшчы і Беларусі істотна адрозніваецца. І перавага тут не на беларускім баку.

«Беларускія меншасці ў Польшчы, на колькі я ведаю, маюць магчымасць вывучаць беларускую мову і культуру. Напрыклад, у Гайнаўцы ёсць беларускі культурны цэнтр, ёсць газеты на беларускай мове, якія фінансуе польскі бок, тое ж «Радыё Рацыя» транслюецца па-беларуску. Я параўноўваю дапамогу для нацыянальных меншасцяў у Польшчы і Беларусі і бачу вялікую дыспрапорцыю», — лічыць пасол.

У Беларусі толькі 12 працэнтаў беларускіх палякаў ведаюць польскую мову. А дзейнасць праўладнага Саюза палякаў у Беларусі Лешак Шарэпка ацэньвае неадназначна, кантактаў з гэтым саюзам Пасольства не мае.

Агулам палітычныя адносіны паміж Беларуссю і Польшчай застаюцца напружанымі. Спадар Шарэпка пажартаваў, што гэтыя канфлікты, відаць, ёсць вынікам таго, што заходняя суседка зычыць Беларусі добрай будучыні. Афіцыйную ноту пратэсту ў беларускае МЗС наконт тэлевізійнага сюжэту польскі бок накіроўваць не будзе, не будзе і судовага іску да Беларускага тэлебачання. Аднак Лешак Шарэпка не выключае, што гэты інцыдэнт можа яшчэ больш пагоршыць беларуска-польскія ўзаемаадносіны.

СПАДЧЫНА

# НАПАМІН ПРА ЮРКУ ВІЦЬБІЧА

**У серыі «Бібліятэка Бацькаўшчыны» выйшла кніга даваеннай прозы беларускага пісьменніка і публіцыста, дзеяча эміграцыі ў Амерыцы Юркі Віцьбіча пад назвай «Лшоно Габоо Бійрушалайм».**

Кніга складаецца з найбольш адметных твораў даваеннай прозы, якія ўпершыню ў Беларусі публікуюцца асобным выданнем. Акампануюць ім успаміны Юркі Віцьбіча пра літаратурнае згуртаванне «Узвышша», сябрам якога ён быў, ды лісты, прысвечаныя міжваеннай беларускай літаратуры.

Назву кнізе дало адно з апавяданняў Юркі Віцьбіча. «Лшоно Габоо Бійрушалайм» — гэта вядомае габрэйскае выслоўе, якое ў перакладзе са старажытнагабрэйскай мовы азначае: «У наступным годзе ў Ерусаліме».

У якасці ўкладальніка кнігі выступіў Лявон Юрэвіч. Ён жа напісаў і прадмову да кнігі. Рэдактары — Ціхан Чарнякевіч і Наталля Гардзіенка.

Па словах рэдактара кнігі Ціхана Чарнякевіча, «у артыкулах, нарысах, шматлікіх лістах Віцьбіч аднаўляе ўсе перыпетыі літаратурнага побыту і гістарычных варункаў, у якія яму давялося жыць да вайны. Кніга «Лшоно Габоо Бійрушалайм», такім чынам, вельмі каштоўны матэрыял не толькі для філолага, але і для гісторыка, краязнаўца, якія цікавяцца Віцебшчынай».

Выданне з'яўляецца новай спробай вяртання творчай спадчыны Юркі Віцьбіча ў Беларусь і разлічана як на літаратуразнаўцаў і гісторыкаў, так і на ўсіх аматараў беларускай літаратуры.

**Паводле Інфармацыйнага цэнтра МГА «ЗБС «Бацькаўшчына»**

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# УСЁ ВЫШЭЙ, ВЫШЭЙ І ВЫШЭЙ

Сяргей САЛАЎЁЎ



**Пасля таго, як беларуская ўлада нарэшце вымушана, з патугамі, з адцягамі, але вырашыла дазнацца пра рэальны курс беларускага рубля, насельніцтва было шакаванае.**

Шакаванае не тым, што на дадатковай сесіі валютнай біржы долар перaскочыў за 8.500 беларускіх рублёў. Зусім не. Шакаванае хутчэй тым, што нашая ўлада ўспрыняла гэта як загад да дзеяння. І пачала дзейнічаць у сваім стылі. Дакладней, нават не ў сваім, а ў стылі Астапа Бэндэра, які ведаў не адну сотню «параўнальна чэснага забірання грошай у насельніцтва».

У Беларусі 20 верасня павышаныя адпускныя цэны на хлеб, малочную прадукцыю і мяса.

«Дадаткова з 20 верасня павышаюцца максімальныя адпускныя цэны на хлеб жытні пшанічна-аржаны, батоны і булачкі з пшанічнай мукі ніздобныя развесам 300 грамаў і больш, малако каровіна пастэрызаванае і кефір з каровінага малака тлустасцю да 3,5% уключна, смятану тлустасцю да 25% уключна, тварог тлустасцю да 9% уключна без смакавых дабавак і напаўняльнікаў — да 10%. На ялавічыну патушную (у паўтушах і чвэртках), свініну патушную (у тушах і паўтушах), буйнакускавы мяса-косны паўфабрыкат у выглядзе водрубаў са свініны — да 20%», — гаворыцца ў пастанове Мінэканоміі №153 ад 19 верасня 2011 года.

Нагадаем, адпускныя цэны на хлеб і малочную прадукцыю павялічваліся на 5% у пачатку верасня, на мяса на 10% — у канцы жніўня. То бок, прыблізна за месяц (калі лічыць па днях) адпускныя цэны павялічваліся тры разы!

Папярэдняй пастановай Мінэканомікі за № 152 былі павышаныя розьнічныя цэны на тытунёвыя вырабы — зноў з 20 верасня. На 10–40%. Цэны на цыгарэты вытворчасці ДТФ «Нёман» «Карона» павышаны на 23% (да 2 950 рублёў за пачак), «Мінск» і «Прэм'ер» — на 29% (2 650), «Glamour» — на 42% (5 400), «Kent» — на 40% (7 000), «Lucky Strike» — на 41% (5 500), «Monte Carlo Super Slims» і «Pall Mall» — на 28,5% (4 500). Цыгарэты вытворчасці мінскага прадпрыемства «Тытунь Інвест» «Camel» даражэюць на 36% (да 6 800), «Monte Carlo» — на 28% (4 500), «Winston» — на 41% (5 500).

Не адстаюць ад родных чыноўнікаў, якія павінны забяспечваць стабільнасць «крыштальнага сасуда», і камерцыйныя арганізацыі. Мабільны аператар velcom абвясціў пра павышэнне з 16 кастрычніка цэн на паслугі сувязі на 7%. Як паведаміла прэс-служба ЗП «Велком», пры гэтым тарыфы на выклікі і дадатковыя паслугі будуць акруглены да аднаго рубля згодна з правіламі арыфметычнага акруглення, тарыфы на разавыя ўзносы і спецыяльныя паслугі — да 10 рублёў.

Варта адзначыць, што Беларусь стала лідарам па росце спажывецкіх цэн сярод асобных краін СНД (Расія, Казахстан, Украіна).

Паводле звестак Белстата, у жніўні ў параўнанні са снежнем 2010 года ў Беларусі цэны ўзраслі на 53,6%, ва Украіне — на 4,1%, у Казахстане — на 5,9%, Расіі — на 4,7%. У жніўні ў параўнанні з ліпенем у Беларусі рост спажывецкіх цэн склаў 8,9%, Казахстане — 0,3%. У Расіі адбылося зніжэнне цэн на 0,2%, ва Украіне — на 0,4%.

Вось табе і «беларускі цуд». Калі ў нас цэны растуць больш чым на паўсотні працэнтаў, у суседніх краінах не дацягваюць і 6 (Казахстан). Што, мы будзем у такіх умовах святкаваць «Дажынкі»? Ды нам трэба проста завязаць рот і маўчаць у анучку, а не ганарыцца сваім асаблівым «шляхам развіцця». Працсей, пэўна, пры такіх раскладах набыць пісталет ды застрэліцца, чым набыць мяса кілаграмаў дзесяць.

Нагадаю яшчэ адну ключавую папярэднюю фразу: «Паводле звестак Белстата». Гэта значыць — толькі паводле звестак афіцыйнага статыстычнага агенцтва. А калі б нашу сітуацыю ацанілі незалежныя эксперты?

З незалежнымі экспертамі праблема. Не таму, што яны такія кепскія. Проста згадваецца анекдот часоў Брэжнева: «Чаму ў краіне няма мяса? — Мы ідзем да камунізму сямімільнымі крокамі. Скаціна за намі не паспявае».

Міжнародны валютны фонд знізіў ацэнку тэмпаў росту валавога ўнутранага прадукту Беларусі ў 2011–2012 гадах. У адпаведнасці з новым прагнозам, які прыведзены ў абноўленым штогадовым дакладзе фонду «Перспектывы развіцця сусветнай эканомікі», гэты паказчык у Беларусі складзе 5% у 2011 годзе (раней планавалася 5,5%) і 1,2% у 2012-м (раней 1,4%). На думку МВФ, інфляцыя ў Беларусі складзе ў 2011 годзе 65,3%. Але ў гэтай лічбе не ўлічана падаражанне хлеба, малака, мяса, цыгарэт на гэтым тыдні.

Дарэчы, пра валюту. Што нашае чыноўніцтва ўмее і любіць рабіць, дык гэта валюту траціць. Група беларускіх чыноўнікаў накіравалася ў Вашынгтон. У склад дэлегацыі ўвайшлі: міністр эканомікі Мікалай Снапкоў, міністр фінансаў Андрэй Харкавец, начальнік галоўнага ўпраўлення знешнеэканамічнай дзейнасці Нацбанка Аляксей Лясны, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення міжнароднага супрацоўніцтва і гандлю, начальнік упраўлення знешнеэканамічнай дзейнасці апарату Савета міністраў Генадзь Мядзведзеў. Мэта камандзіроўкі не названа.

Разам з тым вядома, што гэтымі днямі ў Вашынгтоне адбудзецца штогадовы сход кіраўнікоў Міжнароднага валютнага фонду і Сусветнага банка.

Урад і Нацбанк Беларусі разлічваюць на новую праграму крэдытнага супрацоўніцтва з МВФ. «Папярэдне вызначалася сума крэдыту ў 5–8 мільярдаў долараў. Але, магчыма, нам такія грошы і не запатрабуюцца. Гэта будзе залежаць ад таго, як МВФ ацэніць нашы дзеянні», — заявіла Ермакова 17 верасня, дадаўшы, што фонд ужо ўхваліў апошнія дзеянні ўрада па выхаду на адзіны курс.

Але ж «не хлебам адзіным». 20 верасня ў межах 18-й сесіі Савета па правах чалавека ў Жэневе быў заслуханы даклад Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека аб сітуацыі ў Беларусі. Сутнасць даклада зводзілася да таго, што сітуацыя з правамі чалавека пасля прэзідэнцкіх выбараў 2010 года пагоршылася. У дакуменце ўтрымліваецца шэраг рэкамендацый урада Беларусі. Галоўная рэкамендацыя — неадкладна і без усякіх умоў вызваліць палітычных апанентаў, дэмакратычных актывістаў і журналістаў, якія не ўдзельнічалі ні ў якіх гвалтоўных акцыях. Вярхоўны камісар ААН па правах чалавека рэкамендуе ўладам правесці ўсебаковае і аб'ектыўнае расследаванне акалічнасцяў, пры якіх гэтыя людзі былі затрыманыя, і расследаваць усе выпадкі катаванняў, аб якіх заявілі зняволеныя.

МВФ вельмі не любіць даваць крэдыты тым, хто парушае фундаментальныя правы чалавека, а тым больш — законы эканомікі.

> Беларусь стала лідарам па росце спажывецкіх цэн сярод асобных краін СНД (Расія, Казахстан, Украіна). У жніўні ў параўнанні са снежнем 2010 года ў Беларусі цэны ўзраслі на 53,6%

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ



### АЛЯКСЕЙ ШАМАРАЎ

Беларускі спартовец Аляксей Шамараў (вагавая катэгорыя да 120 кілаграмаў) заваяваў золата чэмпіянату свету па вольнай барацьбе, што праходзіў ў Стамбуле. Акрамя таго, Шамараў атрымаў ліцэнзію на Гульні–2012 у Лондан, куды кваліфікуюцца па шэсць прадстаўнікоў у кожнай алімпійскай вагавой катэгорыі.

У фінале Аляксей Шамараў узяў верх над трохразовым чэмпіёнам свету расіянінам Білялаў Махавыя, які на гэты раз здавольваўся срэбрам. На шляху да тытула беларускі змагар адолеў таксама супернікаў з Германіі, Турцыі, Грузіі і ЗША. Бронзавыя медалі ў катэгорыі да 120 кілаграмаў дасталіся грузіну Давіту Мадзманашвілі і Джамаладдзіну Магамедаву з Азербайджана.

Медаль Шамарава стаў другім для беларускіх прадстаўнікоў вольнай барацьбы на чэмпіянаце свету ў Турцыі. Руслан Шэйхаў (вагавая катэгорыя да 96 кілаграмаў) заваяваў бронзу, а разам з ёй і ліцэнзію на Гульні–2012 у Лондан.

Астатнія беларускія барцы-вольнікі засталіся без медалёў і алімпійскіх ліцэнзій.



### ІГАР БУЗОЎСКІ

Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі шукае ідэі для Беларусі. Першы сакратар ЦК ГА «БРСМ» Ігар Бузоўскі прадставіў праект «100 ідэй для Беларусі». Як перадае БелаПАН словы Бузоўскага, галоўная задача праекта — аб'яднаць як мага больш моладзі з самымі рознымі праектамі, «у любой галіне, у любым напрамку, пачынаючы ад эканамічных праектаў, тэхнічных праектаў, заканчваючы палітычнымі, сацыяльнымі, культурнымі».

Сто лепшых распрацовак увойдуць у віртуальную экспазіцыю, размешчаную на інтэрнэт-партале «Моладзь Беларусі» і на старонцы сацыяльнай сеткі «ВКонтакте» (да слова, праз гэтую сацыяльную сетку ладзяцца і маўклівыя акцыі пратэсту ў Беларусі). Па выніках галасавання аўтары самых паспяховых работ атрымаюць магчымасць прэзентаваць іх на Рэспубліканскім моладзевым інавацыйным форуме.

Для ўдзельнікаў уведзена абмежаванне па ўзросце — да 31 года — і па рэалістычнасці задум. Вечныя рухавікі рэалізоўваць занадта складана, сказаў Бузоўскі, арганізацыю цікавяць больш практычныя ідэі. «У прынцыпе, любая ініцыятыва можа быць рэалізавана і падтрымана. Вядома, гэта мусіць быць неяк сувымерна з грашыма, з фінансамі, што будзе каштаваць гэты праект», — адзначае прадстаўнік БРСМ.

### АЛЯКСАНДР КАНЮК



Аляксандр Канюк прызначаны генпракурорам Беларусі. Раней ён працаваў намеснікам старшыні Вярхоўнага суду. Лукашэнка вызваліў ад пасады генеральнага пракурора Беларусі Рыгора Васілевіча. Гаворачы аб Васілевічы, Лукашэнка адзначыў: «Ён пераходзіць на іншую працу, у яго вельмі шмат магчымасцяў у гэтым плане. Ён чалавек не чужы, і я гэта хачу прама сказаць, каб ніхто не думаў, што Рыгор Васілевіч тут дрэнны быў для прэзідэнта. Гэта наш чалавек, чалавек адданы нашай дзяржаве. Таму мы яго будзем выкарыстоўваць ці на навуковай працы, калі ён гэтага захоча (ён вельмі шмат працуе ў гэтым кірунку), або на выкладчыцкай, альбо на той і іншай, альбо на якой-небудзь дзяржаўнай службе. І гэта ўжо ён сам павінен вырашыць, і мы вызначымся, дзе ён будзе працаваць. У яго вельмі вялікі вопыт і вельмі вялікія веды як у юрыста. Я гэта вельмі цаню і, вядома, ён з «абоймы» не выпадзе».

Аляксандр Канюк нарадзіўся ў 1960 годзе ў Гродне. Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт па спецыяльнасці правазнаўства. З 1982 па 1984 гады быў камандзірам мотастралковага ўзвода 3-га Гвардзейскага танкавага палка 3-й Гвардзейскай танкавай дывізіі 7-й танкавай арміі Беларускай ваеннай акругі. З 1984 года працаваў на розных пасадах у ваенных трыбуналу. У 1993–1997 гадах быў суддзёй Беларускага ваеннага суда. Ад 1997 года — старшыня Мінскага міжгарнізоннага ваеннага суда. З 2006 па 2009 гады працаваў суддзёй і старшынёй Беларускага ваеннага суда. З красавіка 2009 года быў суддзёй і намеснікам старшыні Вярхоўнага Суда. Узнагароджаны ордэнам «За службу Радзіме ва Узброеных Сілах СССР» III ступені, 9 медалямі.

ПРАЦЭС

# ПЫТАННІ ТОЛЬКІ ПАМНАЖАЮЦЦА

Вольга ХВОІН

**Ужо тыдзень ідзе судовы працэс над абвінавачваемымі па справе аб выбуху ў мінскім метро ў красавіку гэтага года. І чым далей, тым больш пытанняў, а не адказаў.**


Дзмітрый Канавалаў


Уладзіслаў Кавалёў

**Для даведкі:**

**Канавалава вінавацяць у злачынствах паводле:**
частак 1, 2, 3 артыкула 289 (тэрарызм)
частак 2, 3 артыкула 295 (незаконныя дзеянні ў дачыненні да агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў)
частак 2,3 артыкула 339 (хуліганства)
часткі 2 артыкула 218 (наўмыснае знішчэнне або пашкоджанне маёмасці)
часткі 1 артыкула 14 (замах на злачынства) Крымінальнага кодэксу Беларусі

**Кавалёва вінавацяць у злачынствах паводле:**
часткі 6 артыкула 16 (дапамога ў злачынстве)
часткі 3 артыкула 289 (тэрарызм)
часткі 3 артыкула 295 (незаконныя дзеянні ў дачыненні да агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў)
частак 2, 3 артыкула 339 (хуліганства)
часткі 2 артыкула 218 (наўмыснае знішчэнне або пашкоджанне маёмасці)
часткі 2 артыкула 405 (укрывальніцтва злачынстваў)
частак 1, 2 артыкула 406 (неданясенне аб злачынстве)

Выбух 11 красавіка 2011 года стаўся ў нейкім сэнсе пераломным для грамадскай свядомасці. Пэўнасць, што Беларусь стабільная-мірная краіна, імгненна знікла. Цяпер, бадай, кожны трымаецца думкі, што фатум можа насцігнуць у любы момант. І дзяржава не гарантуе абарону ад гэтага. У выніку выбуху 11 чалавек загінулі адразу, яшчэ чацвёра памерлі ў бальніцах, агулам у шпіталі і па медыцынскую дапамогу звярнуліся больш за двесце чалавек. Ужо 13 красавіка Аляксандр Лукашэнка заявіў, што трое падазраваных затрыманыя і прызналі сваю віну. Не толькі ў выбуху ў метро, але і ў датычнасці да здзяйснення іншых выбухаў: у 2008 годзе ў Мінску ў Дзень незалежнасці і яшчэ больш ранніх — у Віцебску.

Нагадаю, што ў выніку выбуху 2008 года на святкаванні Дня Незалежнасці былі параненыя каля 50 чалавек. Паводле афіцыйнай версіі, выбух быў здзейснены «з хуліганскіх мэтаў». Выбух у мінскім метро 11 красавіка 2011 года кваліфікуецца як тэракт.

## Адмова ад паказанняў

Судовы працэс над Дзмітрыем Канавалавым і Уладзіславам Кавалёвым пачаўся 15 верасня ў Доме правасуддзя ў Мінску. Яны з'яўляюцца абвінавачваемымі ў выбуху на станцыі метро «Кастрычніцкая». Старшынствуе на працэсе намеснік кіраўніка Вярхоўнага суда Беларусі Аляксандр Федарцоў. Бок дзяржаўнага абвінавачання прадстаўляе намеснік Генеральнага пракурора Аляксей Стук.

Доказная база асноўнага абвінавачваемага Дзмітрыя Канавалава пакуль грунтуецца на яго асабістых прызнаннях і паказаннях Уладзіслава Кавалёва. Кавалёў 13 красавіка падчас допыту падрабязна расказваў, як у Мінск прыехаў Канавалаў, каб зрабіць выбух у метро.

Маўляў, Канавалаў 9 красавіка патэлефанаваў і сказаў, што яму трэба ў Мінск па справах. Кавалёў сустрэў свайго знаёмца на чыгуначным вакзале 10а красавіка, ускінуў вялікую сумку на плячо, каб дапамагчы яе несці. А Канавалаў яму сказаў, што там бомба, дык трэба быць асцярожным. На чыгуначным вакзале Канавалаў адкрыў сумку і паказаў яе змесціва — дзве пяцілітровыя пластыкавыя бутэлькі з нейкім рэчывам жаўтаватага колеру, зверху прыкрытыя паперай для ўпакоўкі падарункаў. Сумка, паводле паказанняў Кавалёва, была цяжкая, каля 20-ці кілаграмаў. З вакзала Канавалаў і Кавалёў неслі сумку ў дзве рукі. Потым паехалі да станцыі метро «Фрунзенская», там на вуліцы Караля пайшлі ў агенцтва нерухомасці і на той жа вуліцы знялі аднапакаёвую кватэру на суткі.

Кавалёў у часе допыту заявіў: Канавалаў гаварыў, што збіраецца ўзарваць метро, бо рана ці позна зверацца адбіткі пальцаў. Маўляў, усё адно пасадзяць, губляць няма чаго. Расказаў прыяцелю Канавалаў, што збіраўся скончыць жыццё самагубствам, паказваў нейкія жэлацінавыя капсулы. Кавалёў расказаў, што ў яго былі думкі скрасці сумку, але, магчыма, спачатку не асэнсаваў заявы Канавалава, што той мае намер зладзіць выбух.

Потым меркаваныя падрыўнікі пайшлі ў краму, купілі салаты і гарэлкі. Дзмітрый пазваніў сваім сяброўкам, з якімі пазнаёміўся праз сацыяльную сетку «ВКонтакте». Вечарам прыйшлі Яна Пачыцкая і яшчэ адна дзяўчына. Застолле з гарэлкай і жартамі працягвалася да пятай раніцы. Сумка ў гэты час стаяла ў пакоі за занавескаю, якою пакой і быў перагароджаны на дзве часткі. 11 красавіка Кавалёў прачнуўся а 7 раніцы і паехаў на працу на МАЗ — там ён працаваў электрыкам. Па абедзе Кавалёў сышоў з працы, прыехаў да Канавалава і зноў працягнулася п'янка-гулянка. У часе гэтай п'янкі Канавалаў паказваў нейкі белы прадмет з кнопкаю, падобны на выключальнік. Цікава, што відэазапіс допыту прыпыняўся, а пасля таго, як камера праз колькі гадзін уключалася, зноў Кавалёў пачынаў распавядаць новыя падрабязнасці, якія да гэтага не згадваў, хаця на такое забыцца даволі цяжка. Напрыклад, ён заявіў, што бачыў, як Канавалаў скручваў драты на бомбе, сам у гэтым не ўдзельнічаў, але стаяў і глядзеў, каб Яна Пачыцкая, якая «завісала» на кватэры ўжо трэція суткі, не падышла і не пабачыла гэтых маніпуляцый.

Кавалёў падчас допыту распавёў, што быццам бы адгаворваў Канавалава ладзіць выбух, і быццам бы яму падалося, што той пагадзіўся з такой парадай. Праўда, адказы на пытанні следства выглядалі даволі блытанымі: «Чаму не пранян мераў, каб спыніць Канавалава?» — «Не ведаю». «Спрабаваў адгаворваць вечарам перад тым, як ён пайшоў, гаварыў, што ён п'яны, не пусціць у метро. Падавалася, што ён перадумаў».

У нейкі прамежак часу, калі Кавалёў спаў, Канавалаў сыходзіў з кватэры. Пра выбух у метро Кавалёў даведаўся з навін па тэлебачанню. «У мяне не было сумневаў, што гэта здзейсніў Дзмітрый Канавалаў, — заяўляе ў часе допыту Кавалёў. — «Вы асэнсоўваеце ўсю грамадскую небяспеку?» — «Так».

Таксама ў часе допыту Кавалёў расказаў, што Канавалаў яму распавядаў, што меў датычнасць да выбуху ля стэлы ў Мінску, адна бомба не спрацавала, і там застаўся яго адбітак пальца. Зрабіў гэта ён адзін. «Мэту выбухаў не абмяркоўвалі». Аднак цікава, што Кавалёў не змог дакладна назваць, калі быў выбух ля стэлы ў Мінску — ні год, ні дзень. Толькі сказаў, што гэта «было нейкае свята». Са слоў Кавалёва, выбухі ў Віцебску ў 2005 годзе таксама зладзіў Канавалаў. А расказваў гэта, бо «даваўраў, можа хацеў пахваліцца. Пра мэты не гаварыў».

Кавалёў сказаў, што Дзмітрый Канавалаў не рэлігійны чалавек, «палітыкай не захапляўся, нядобрых выказванняў у бок кіраўніцтва дзяржавы таксама не было». Маўчаў Кавалёў, бо хацеў «прыкрыць» сябра.

На пытанне следства «Ці мог сканструяваць Канавалаў такую выбухоўку?» Кавалёў адказвае «Напэўна, так. Ведаю, што канструкцыю зрабіў сам. Па-мойму, ён вырабіў выбуховае прыстасаванне сам. Але невядома дакладна, дзе ўзяў выбуховае прыстасаванне. Не вядома, якім чынам прывёў у дзейнасць выбухоўку».

Яну Пачыцкую, Дзмітрыя Канавалава і Уладзіслава Кавалёва затрымалі на здымнай кватэры.

Паводле паказанняў Кавалёва, Дзмітрый Канавалаў з дзяцінства захапляўся піратэхнікай і рабіў выбуховыя пакеты.

## Прафілактычныя размовы

Агулам у відэазапісе паказанняў адказы Кавалёва выглядаюць крыху дзіўна, бо ён рэгулярна гаворыць «не ведаю», а потым дадае «магчыма, я думаю так». То бок шэраг паказанняў заснаваныя не на факце, а на нейкіх меркаваннях і гіпотэзах Кавалёва.

Падчас суду Кавалёў адмовіўся ад гэтых паказанняў. Ён заявіў, што перад допытам быў ціск. Да яго неаднаразова прыходзілі «на размовы» супрацоўнікі КДБ, адвакат не прысутнічаў тады. Апэратыўнікі галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю ў ноч перад допытам правялі «прафілактычную размову». Пагражалі суровым пакараннем, маўляў, усё адно ніхто не паверыць, што ён не саўдзельнік, таму трэба як мага больш даць паказанняў, тады пойдзе па артыкулу за неданясенне. Зачытвалі яму і Крымінальны кодэкс — «там быў цырк, чыталі артыкулы з Крымінальнага кодэксу, прапаноўвалі параўнаць пакаранне». Быццам бы гэтыя ж аператыўнікі і расказалі яму, што трэба распавесці пра такія падрабязнасці, як бутэлькі, прыстасаванне з кнопкаю для выбуху, скручванне дроту на выбухоўцы. «Падчас дазнання ноччу аператыўнікі гаварылі: «Няўжо ты не бачыў, як там зрошчваліся драты?» — распавёў у судзе Кавалёў.

У выніку ў судзе Уладзіслаў Кавалёў заявіў, што Дзмітрый Канавалаў не ўзрываў бомбу ў метро. «Я думаю, Дзмітрый не ўзрываў бомбу ў 2011 годзе. Ці мала што там паказвалі (маюцца на ўвазе кадры відэаназірання, на якіх Дзмітрый Канавалаў ідзе ў метро з сумкай на станцыю «Кастрычніцкая», а пасля выбуху назад — без сумкі)», — гаворыць Кавалёў. Ён сцвярджае, што яму паказвалі кадры, дзе Канавалаў ішоў з сумкай у метро, але не паказалі, дзе Дзмітрый быў ужо без сумкі.

Кавалёў агулам асоба цікавая: з яго прыватнага дзённіка вынікае, што ён марыў зарабіць мільён долараў за пяць-дзесяць гадоў. Для гэтага рыхтаваў сябе маральна — чытаў розныя кнігі па псіхалогіі, каб мець пазітыўныя ўстаноўкі на жыццё. Канавалаў псіхалогіяй не цікавіўся.

## Недавер пацярпелых

Пацярпелыя, якіх па справе праходзіць некалькі соцень, вельмі насцярожана ставяцца да судовага працэсу. Безапеляцыйных крыкаў «укрыжуй!» няма. Ёсць пытанні: якім чынам было вызначана, што менавіта Канавалаў і Кавалёў маюць дачыненне да выбуху, чаму спачатку высокія чыны заяўлялі, што «аналагаў бомбы няма ў свеце», а Канавалаў у сваіх паказаннях распавёў, што інфармацыю для стварэння бомбы знайшоў у інтэрнэце, а неабходныя кампаненты купіў на рынку ў Віцебску.

Таксама падчас допыту 18 красавіка Канавалаў адмовіўся ад дадзеных раней паказанняў аб сваёй датычнасці да выбуху ў Віцебску ў 2005 годзе. Следчаму ён заявіў, што раней прызнаўся ва ўчыненні гэтых злачынстваў пад ціскам («прымяненне катаванняў») супрацоўнікаў міліцыі пасля затрымання 12 красавіка. Ён расказаў, што ў памяшканні Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй МУС двое супрацоўнікаў міліцыі паклалі яго на жывот, рукі ў наручніках зацягнулі пад складзеныя ззаду накрыж ногі. Паводле слоў Канавалава, яму сказалі, каб ён даў паказанні па выбухах у Мінску ў 2011 і 2008 гадах і ў Віцебску ў 2005-м. Разам з тым на гэтым жа допыце Канавалаў заявіў, што прызнае сваю замешанасць у выбухах у Мінску ў 2008 і 2011 гадах.

## З пацярпелых у хуліганы

Суддзя Федарцоў забараніў журналістам кантактаваць з пацярпелымі. Паводле яго слоў, інтэрв'ю з гэтымі людзьмі можа расцэньвацца як уплыў на судовы працэс. Таксама журналістам параілі ўстрымацца ад каментавання матэрыялаў гучнай справы.

Вечарам 20 верасня з невядомых прычын у Мінску быў затрыманы Аляксандр Круты. На судзе па справе аб тэракце ў мінскім метро ён прадстаўляе інтарэсы сваёй дачкі Інэсы, пацярпелай падчас выбуху 11 красавіка. Як сказала Інэса, бацька патэлефанаваў ёй напярэдадні прыкладна ў 20 гадзін і сказаў толькі, што яго затрымалі і даставілі ў Маскоўскае РУУС. Яму інкрымінуецца ўчыненне злачынства, прадугледжанага часткай 1-й артыкула 339-га Крымінальнага кодэкса «Хуліганства». У чым дакладна ён абвінавачваецца, сваякам у міліцыі адмовіліся сказаць. Родным затрыманага было толькі паведамлена, што пытанне пра абранне ў адносінах да яго меры стрымання будзе вырашана вечарам 21 верасня, — перадае БелаПАН. Інэса Крутая мяркуе звярнуцца да суддзі з заявай, у якой запатрабуе прыпыніць працэс да таго час, пакуль яе бацька не будзе зноў дапушчаны ў суд у якасці яе прадстаўніка. Аляксандр Круты актыўна падводзіў сябе ў працэсе па справе аб тэракце. Менавіта яму належала хадайніцтва аб пераносе суда да вырашэння пытання аб адмене ў Беларусі смяротнай кары, аб стварэнні інстытута прысяжных засядацеляў і ўвядзення іх у працэс.

ГРОШЫ

# КАНЕЧНЫ ПРЫПЫНАК ЦІ ПАЎЗА?

Вольга ХВОІН

**Беларускі рубель цягам апошняга тыдня пакрысе стабілізуецца. Пакуль не ідзе размова аб істотным узмацненні яго пазіцый, аднак і рост курсу валют не назіраецца.**

Па дадзеных Беларускай валютна-фондавай біржы, 21 верасня ў таргах доларам удзельнічаў 21 банк. Аб'ём таргоў склаў 27 млн. 895 тыс. долараў (попыт — 27 млн. 895 тыс., прапанова — 16 млн. 63 тыс.). У таргах расійскім рублём удзельнічала 24 банкі. Курс вырас на 0,59 рубля і склаў 173,98 беларускага рубля за адзін расійскі. Аб'ём таргоў склаў 424 млн. 34 тыс. расійскіх рублёў (попыт — 425 млн. 159 тыс., прапанова — 424 млн. 34 тыс.). У таргах еўра ўдзельнічалі 20 банкаў. Аб'ём таргоў склаў 6 млн. 109 тыс. еўра (попыт — 6 млн. 822 тыс., прапанова — 6 млн. 109 тыс.), а курс вырас на 14 рублёў і склаў 7 472 рубля за еўра.

З пачатку года афіцыйны курс беларускага рубля да валютнага кошыка знізіўся на 82,28%, да долара — на 82,17%, да расійскага рубля — на 76,74%, да еўра — на 88,11%.

Па свабодным курсе долар прадаюць па 7 834 рублі, еўра — 11 179, расійскі рубель — 260 беларускіх рублёў за адзінку.

Нацыянальны банк Беларусі мае намер рухаць адзіны курс у бок афіцыйнага. «Адзіны курс прадугледжвае фарміраванне зыходзячы з попыту і прапановы — трэба ўлічваць, што Нацбанк будзе працягваць недапушчэнне моцнага ўмацавання ці моцнага паслаблення рубля. Пры неабходнасці будзем умешвацца», — сказаў намеснік старшыні праўлення Нацбанка Беларусі Тарас Надольны. Паводле яго слоў, «няма пагадненняў з урадам аб звядзенні курса на канкрэтным значэнні. Вельмі цяжка спрагназаваць курс, які будзе збалансаваным. Ёсць рэзервы, каб адзіны курс рухаўся да афіцыйнага». Пры гэтым Надольны дадаў, што «цяпер казаць 5 тысяч, 5,5 тысячы, ці 6 тысяч — бессэнсоўна».

На адзіны курс рубля ўлады плануюць выйсці ў трэцяй дэкадзе кастрычніка. «Тэхнічна самы лепшы час выхаду на адзіны курс — гэта 20-я дні месяца: падатковыя выплаты, заканчэнне канвертацыі валюты для разлікаў за газ. Калі ўсё пойдзе па плане, у кастрычніку мы закрыем гэтае пытанне», — заявіў віцэ-прэм'ер Сяргей Румас. Аналагічную па сутнасці заяву зрабіў і Аляксандр Лукашэнка: «Што мы бачым літаральна праз тыдзень пасля таго, як вы захацелі абсалютна рынкавага курсу, рынкавых адносін? Калі вам праўду сказаць, то сёння Міхаілу Мясніковічу і Надзеі Ермаковай трэба працаваць так, каб гэты долар не абваліўся ніжэй устаноўленых 5 тысяч рублёў».

Разам з тым суб'екты фінансавага рынку пакуль асцярожныя ў сваіх ацэнках і стабілізацыю курсу звязваюць з тым, што цяпер канец месяца — прадпрыемствы вымушаныя сплаціць падаткі, правесці заробак па бухгалтэрыі. З гэтымі мэтамі многія прыватнікі і канвертуюць цвёрдую валюту ў рублі, што выроўнівае попыт і прапанову на рынку і, адпаведна, уплывае на курс. Ёсць і псіхалагічны момант — наяўнасць валюты ў абменніку не спараджае стыхійнага чорнага рынку, на якім курс валют звычайна крыху завышаны з улікам магчымых стратаў.

Відаць, натхніўшыся першымі поспехамі, урад цяпер вядзе работу над рознымі сцэнарамі сацыяльна-эканамічнага прагнозу на 2012 год, робячы стаўку на «ўмерана-спрыяльны» варыянт. Паводле слоў віцэ-прэм'ера Сяргея Румаса, гэты сцэнар грунтуецца на ўмераным росце эканомікі, абмежаванні грашовай эмісіі на ўзроўні не больш за 3% ВУП, падтрыманне курсу беларускага рубля на ўзроўні, які забяспечвае зніжэнне дэфіцыту аплатнага балансу, а таксама мерах сацпадтрымкі неабароненых слаёў насельніцтва. «У лістападзе мы будзем мець перспектыўны план развіцця эканомікі на 3 гады», — паабяцаў віцэ-прэм'ер. Ён таксама запэўніў, што ў праекце бюджэту прадугледжваецца зніжэнне падатковай нагрузкі.

«Зніжэнне стаўкі падатку на прыбытак — канкрэтны памер пакуль разлічваецца, але само паніжэнне — пытанне вырашанае. Будзе ўведзены механізм пераносу страт на будучыя падатковыя перыяды», — паведаміў Румас.

**Натхніўшыся першымі поспехамі, урад цяпер вядзе работу над рознымі сцэнарамі сацыяльна-эканамічнага прагнозу на 2012 год, робячы стаўку на «ўмерана-спрыяльны» варыянт**

У студзені–ліпені за кошт дэвальвацыі, па дадзеных Белстата, сальда ў гандлі з Еўрасаюзам склала 3 776 млрд. долараў, сальда ў гандлі з Расіяй застаецца адмоўным — 5 959 млрд. долараў. Гэтыя паказчыкі, канешне, палепшылі эканамічную карціну дзяржавы. Аднак застаецца небяспека таго, што сітуацыю «з'ядуць» імклівыя інфляцыйныя працэсы, што ў выніку вядзе да падвышэння выдаткаў унутры краіны. Так, за студзень–жнівень інфляцыя ў Беларусі склала 53,6%. А індэкс спажывецкіх цэн за гэты год можа перавысіць 100%.




КАЛОНКА КАНСТАНЦІНА СКУРАТОВІЧА

# МЫТНЯ ДАБРО НЕ ДАЕ



**Па афіцыйных звестках, за 7 месяцаў бягучага года гандлёвае сальда Беларусі ў межах Мытнага саюза было адмоўнае ў памеры 5 703,8 мільёна долараў.**

Прычым, у гандлі з Расіяй імпартовыя выдаткі пераўзышлі экспартныя набыткі на 5 958,7 млн. долараў, у гандлі з Казахстанам вартасць беларускага экспарту на 254,9 млн. долараў перавысіла выдаткі на імпарт з гэтай краіны. Велічыня дадатная, але несупастаўная з першай — адмоўнай.

Зыходзячы з гэтага, ужо сёння можна смела сказаць — уступленне Беларусі ў Мытны саюз ніякіх асаблівых выгод Беларусі не прынесла. На самай справе, памер таваразвароту Беларусі ў гандлі з Расіяй і Казахстанам падвысіўся на 41,6% (экспарту — на 42,3%, імпарту — на 41,2%), але ж і мінулагодняе (за сем месяцаў) адмоўнае сальда (4 079,5 млн. долараў), так бы мовіць, стала яшчэ больш адмоўным — гандлёвы дысбаланс павялічыўся больш чым на 1,5 мільярда долараў.

Атрымліваецца дакладна па класіку — лезу я наперад, асадзі назад. Карацей, гандлёвыя стасункі Беларусі на гэтай рынкавай прасторы засталіся такімі, якімі былі і падчас праклямацыі Саюзнай дзяржавы. Кожны год пачынаўся перамовамі наконт льготных паставак у Беларусь нафтагазавай сыравіны, льготы вызначаліся, але ў выніку кожны гаспадарчы год эканоміка Беларусі пачынала працаваць на больш жорсткіх умовах. У выніку адмоўнае сальда значна павялічвалася, і трэба было зноў дамаўляцца наконт льготных стабілізацыйных крэдытаў, пад фактычны заклад беларускіх актываў і абяцанкі палітычнай лаяльнасці да дзяржавы-хаўрусніцы.

Рашэнні, якія прымаліся, ніколі не былі прынцыпова вычарпальнымі, насуперак шматлікім заявам Лукашэнкі — з аднаго боку, Ельцына, Пуціна, Мядзведзева — з другога. У выніку Беларусь так і не атрымала газ «па кошце Смаленскай вобласці», Расія — «фамільнага срэбра» беларусаў.

І Лукашэнка, і яго расійскія калегі не аднойчы падкрэслівалі, што «в отношениях между братскими странами и народами торг неуместен», але ж таргуюцца ў лепшых традыцыях звычайнага базару. З узаемнымі абразамі, праклёнамі, з пажаданнямі, кшталту, каб у цябе ўсё пагніло, каб твая кабыла нагу зламала...

Але праз паўзу, сыходзяцца зноў.

Такім чынам, бакі сябе паводзяць паслядоўна, выцыганьваючы кожны раз нейкія прэферэнцыі. Лукашэнка праз відовішча стабільнай і растучай эканомікі даволі ўдала набываў палітычны капітал, яго апанентам у гэтай справе больш спрыяла добрая кан'юнктура на сусветных сыравінных рынках. Пры гэтым узаемныя чаканні прынцыпова не супадаюць. Калі Лукашэнка збіраецца неабмежаваны тэрмін кіраваць незалежнай краінай, якая карыстаецца таннымі рэсурсамі суседкі, то кіраўніцтва апошняй чакае ад яго канкрэтных доказаў заяўленай некалі інтэграцыйнай схеме.

А магчыма, ужо і не чакае. Бо неаднаразова агучаныя пуцінскімі міністрамі намеры перавесці эканамічныя стасункі з Беларуссю на рынкавыя рэйкі паслядоўна праводзяцца ў жыццё. Прыкладам, цана на расійскую нафту ў параўнанні з мінулым годам падвысілася на 12,3%, кошты на прыродны газ — на 34,6%.

Зразумела, эканоміка Беларусі, яе прамысловасць, сельская гаспадарка і іншыя галіны маюць шмат адметных якасцей, і ў шмат чым пераўзыходзяць расійскіх канкурэнтаў. Але не настолькі, каб, кінуўшы-рынуўшы, адпраўляцца на завяванне сусветных рынкаў. Прыкладам, праект па частковаму забеспячэнню нафтавых патрэб эканомікі з дапамогай Венесуэлы, можна лічыць, цалкам праваліўся. Бо пастаўкі нафты з гэтай краіны за сем месяцаў склалі 953,2 тысяч тон па цане 834 долары за тону (з Расіі — 10351 тысяч тон па цане 449 долараў за тону), а нешта іншае пакуль што нават у павестку дня не ставіцца. З другога боку, трактары ды іншая тэхніка, пастаўленыя ў Венесуэлу, патрабуюць сэрвіснага абслугоўвання. Але пры нашай афіцыйна ледзь не самай лепшай у свеце сістэме адукацыі, ходзяць чуткі, вельмі цяжка знайсці спецыялістаў, якія б мелі дастатковую моўную і адначасова інжынерную культуру.

Дык вось, пры шматлікіх поспехах і дасягненнях, беларуская эканоміка мае карэнны недахоп, пра які ўсе ведаюць, але не хочуць ні гаварыць пра яго, ні рабіць нешта для яго пераадолення. Можа таму, што гэта немагчыма ў рамках выбранай мадэлі, якая нават існуе толькі дзякуючы гэтаму недахопу. Беларуская эканоміка неэфектыўная. Гэта значыць, што для вытворчасці адзінкі таварнай прадукцыі ёй патрэбна нашмат больш эканамічных даброт, чым асноўным канкурэнтам. Вось напісаў я гэта, і адразу ўявіў, як узвінела ад дружных пярэчанняў хору апанентаў, якія гучна распавядаюць аб уяўных перавагах калгаснага ладу. А калі так, то нічога і не зробіцца.

Аб гэтым добра ведаюць у Белстаце, кожны даклад якога сцвярджае, што асноўнымі фактарамі фармавання адмоўнага сальда знешняга гандлю таварамі з'яўляецца экспартна-імпартныя аперацыі з прамежкавымі таварамі (энерганосьбіты, сыравіна, матэрыялы і камплектуючыя). На энергетычныя тавары прыпадае (за сем месяцаў) 49,8% экспарту і 52,5% імпарту прамежкавых тавараў. Іх пастаўлена на знешні рынак на суму 7 716,3 млн. долараў, што ў 2,4 разы болей, чым за адпаведны перыяд мінулага года. Імпарт энергетычных тавараў склаў 10 138,1 млн. долараў, што болей у 1,7 разы.

Інакш кажучы, па гэтай таварнай групе адбылося нязначнае (сезоннае?) скарачэнне адмоўнага сальда, і не адбылося ніякіх прынцыповых змен. Паранейшаму імпартныя выдаткі растуць хутчэй за экспартныя здабыткі. І менавіта па гэтай таварнай групе ў гандлі з Расіяй адмоўнае сальда павысілася на 3,1 мільярды, дасягнуўшы рэкорднай сумы ў 9,8 мільярда долараў.

Не, гэтая мытня нам дабро не дае.

ТРЭЦІ СЕКТАР

# ВАЛЯНЦІН СТЭФАНОВІЧ

Аляксандр ТАМКОВІЧ

**Наколькі я ведаю, Валянціну Стэфановічу, як і Алесю Бяляцкаму, прапаноўвалі стаць палітуцекачом. Абодва ад такога статуса адмовіліся. Больш за тое, Валянцін Стэфановіч мае намер вярнуцца ў Беларусь. І гэта нягледзячы на тое, што пра краты свайго паплечніка па «Вясне» ведае не менш за астатніх. Чаму? Вельмі спадзяюся, што мой нарыс і будзе адным з адказаў на гэтае пытанне.**



## Жыццёвы дэбют

Звычайна хлапчукоў называюць у гонар іх дзядоў альбо бацькоў. Валянціна Стэфановіча назвалі на памяць бабулі — Валянціны Сухаржэўскай. На жаль, яна не дачакалася немаўля сваёй дачкі, жыццёвы дэбют якога адбыўся 14 кастрычніка 1972 года.

Дарэчы, у гэты ж дзень (толькі ў 1943 годзе) нарадзіўся і другі вядомы праваабаронца — Гары Пятровіч Паганяйла. Нічога не хачу сказаць пра такое супадзенне, а проста канстатую факт. Думаю, для тых, хто кажа пра наканаванасць нашага лёсу, ён будзе вельмі-вельмі цікавым.

Мама Валянціна Антаніна Сухаржэўская (яна не насіла прозвішча мужа) нарадзілася ў Мінску ў 1953 годзе. Праз свайго сібірскага бацьку яна мае выразна азіяцкую знешнасць і ў дзяцінстве праз гэта зведала шмат крыўдаў і ад дзяцей, і ад дарослых, якія праганялі яе ў «Кітай да свайго бацькі Мао Цзэдуна». Часта плакала. Менавіта таму Валянцін Стэфановіч шчыра не прымае расістаў і ўсялякіх аматараў «чысціні нацыі».

Антаніна Сухаржэўская добра малюе. Пасля школы яна паступіла на архітэктурнае аддзяленне Мінскага архітэктурнага тэхнікума, дзе і пазнаёмілася з бацькам (вучыўся ў адной групе) будучага вядомага праваабаронцы.

Па пашпарту бацьку Валянціна Стэфановіча завуць Канстанцін, але сам ён сябе называе — спадар Кастусь. Нарадзіўся ў мястэчку Глуск Магілёўскай вобласці ў 1952 годзе. Пасля заканчэння школы паступіў ва ўзгаданую вышэй навучальную ўстанову, але, у адрозненне ад сваёй жонкі, якая 20 гадоў прапрацавала ў праектным інстытуце «Белпроппраект», займаўся практычнай будоўляй. Працаваў прарабам, начальнікам будаўнічых участкаў розных прадпрыемстваў. Каб зарабіць больш грошаў, часта быў вымушаны пакідаць сям'ю і ад'язджаць на заробкі на Алтай, у Карэлію.

Валянцін Стэфановіч па гэты дзень памятае, як ён з мамай часта ездзіў сустракаць бацьку на вакзал. Той прыязджаў з вялікай барадой і дзіўнымі падарункамі: кедравымі арэхамі ці рагамі нейкіх горных казлоў.

## Першыя цяжкасці

Сям'я Валянціна Стэфановіча, як і большасць у той час, не была заможнай. Перш за ўсё таму, што была вельмі маладой. Маці ўсяго 18 гадоў, бацьку — 19.

Нягледзячы на тое, што нарадзілася дзіця і жонка знаходзілася ў шпіталі пасля родаў, нягледзячы на ўсе цяжкія сямейныя абставіны, увосень 1972 года Кастуся Стэфановіча прызвалі ў войска. Часам Валіка дагледала нават 16-гадовая сястра яго маці, а часам і аднагрупнікі па тэхнікуму. Ніхто тады нават дапусціць не мог, што ў будучым «грамадскі» дзіцёнак будзе самаахвярна абараняць правы гэтага самага грамадства.

У 1980 годзе Валянцін Стэфановіч пайшоў у першы клас сталічнай школы № 25 з паглыбленым вывучэннем англійскай мовы, бо тады жыў на Партызанскім праспекце ў раёне «старога аўтазавода». Праз тры гады сям'я Стэфановічаў замест маленькай «палутаркі», якую пабудавалі нямецкія ваеннапалонныя, атрымала новую «двухпакаёўку» на вуліцы Асаналіева, і ён стаў хадзіць у школу № 11, дзе ўжо не было ніякіх «уклонаў».

Пачатак 1990-х гадоў — цікавы і цяжкі час. У людзей адбылася кардынальная змена арыенціраў. Калі раней для чалавека галоўным у жыцці была адукацыя, то цяпер — грошы.

Менавіта ў гэты момант і адбыўся парадокс, які значна паўплываў на ўвесь далейшы лёс Валянціна Стэфановіча. Як і многія сябры, ён хацеў займацца бізнэсам, але бацькі падказалі іншую каштоўнасць — веды. Яны разумелі, што вышэйшая адукацыя мае сваю вартасць ва ўсе часы.

У 1993 годзе Валянцін паступіў на юрыдычны факультэт Міжнароднага інстытута працоўных і сацыяльных адносінаў, заснавальнікам якога была ФПБ (Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі), а спецыялізацыяй абраў «Правазнаўства. Адвакатура і натарыят». Нагадаю, што афіцыйныя прафсаюзы былі тады значна прэстыжней, чым сёння. Студэнцкі курс Валянціна Стэфановіча быў досыць моцным. Адтуль выйшлі адвакаты, следчыя, натарыусы, супрацоўнікі юрыдычных аддзелаў выканкамаў, міністэрстваў і нават цяперашні намеснік Міністра юстыцыі Беларусі Ігар Тушынскі.

Вучыўся Валянцін Стэфановіч з захапленнем. Скончыў ВНУ з «чырвоным дыпломам» і хацеў стаць адвакатам, але лёс вырашыў інакш.

Пасля рэферэндуму 1995 года і публічнага ганьбавання нацыянальнага сцягу, ён даў сабе слова, ніколі не працаваць у дзяржаўных структурах новай улады. У 1996 годзе пасля падпісання так званых «саюзных дамоваў» вырашыў, што незалежнасць краіны знаходзіцца пад пагрозай і прыняў актыўны ўдзел ва ўсіх акцыях «мінскай вясны». Затым прымаў удзел у стварэнні структураў Маладога фронту.

У сакавіку 1997 года Валенціна Стэфановіча ўпершыню затрымалі на акцыі пратэсту. «Далі 5 сутак адміністратыўнага арышту. Пры гэтым збілі ў РУУС Кастрычніцкага раёна».

## Свядомы выбар

Нічога дрэннага не хачу сказаць, пра тых, хто публічна выступае за развіццё беларускай мовы, а ў асабістым жыцці жыве па большасці карыстаецца рускай. На жаль, такая сёння сітуацыя, і аўтар тут — не выключэнне. Таму ў мяне і такая павага да сям'і Валянціна Стэфановіча — прынцыпова беларускамоўнай.

І гэта невыпадкова. Валянцін пачаў адчуваць сабе беларусам, палюбіў беларускую мову, стаў размаўляць на ёй выключна дзякуючы свайму бацьку. Менавіта той заўсёды з вялікай любоўю гаварыў пра Беларусь і з горыччу аб знікненні мовы, тоеснасці беларусаў. Напрыканцы 1980-х бацька Валянціна з вялікім энтузіязмам сустрэў з'яўленне руху БНФ. Ідэі нацыянальнага адраджэння, незалежнасці Беларусі былі і застаюцца для яго вельмі важнымі каштоўнасцямі.

Упершыню Валянцін Стэфановіч пачуў, як моладзь размаўляе па-беларуску, на сходзе «Талакі» ўвосень 1988 года, куды яго завёў стрыечны брат, студэнт першага курсу БДУ. Атрымаў вельмі моцнае ўражанне. Юнаку было тады толькі 16 гадоў.

…Ён жанаты ўжо 10 гадоў. Аліна скончыла мінскі Інстытут замежных моваў і выдатна валодае англійскай мовай. Перакладае нават «сінхрон», што вельмі цяжка і для прафесійных перакладчыкаў.

**Арышт Алеся Бяляцкага Валянцін Стэфановіч (як і многія) лічыць выключна палітычнай справай. Але, у адрозненне ад большасці з нас, у сваіх высновах ён кіруецца не эмоцыямі, а юрыдычнымі нормамі**

Пазнаёміліся яны ў 1996 годзе ў Маладым фронце. Пазней яна была актывісткай ЗБС (Задзіночанне беларускіх студэнтаў). Пажаніліся ў ліпені 2001 года. Старэйшаму сыну Валянціна ўжо 6 гадоў, яго завуць Адам-Дамінік, дачцэ Яне-Вераніцы 7 месяцаў. Размаўляюць усе паміж сабой толькі па-беларуску.

## Гуканне вясны

У 1998 годзе Валянцін Стэфановіч атрымаў «чырвоны» дыплом свайго ВНУ і пачаў працаваць юрыстконсультам на Мінскім падшыпнікавым заводзе, а потым па прапанове Алеся Бяляцкага далучыўся да праваабарончага цэнтру «Вясна», які быў адной з «першых ластавак» беларускага «трэцяга сектару».

Праца ў «Вясне» мае розныя бакі. З цяжкіх можна адзначыць тое, што прыходзіцца ўвесь час мець справу з негатывам, з чалавечай бядой. Гэта цяжка найперш маральна. Складана размаўляць з роднымі людзей, якія патрапілі ў бяду.

Пры такой справе вельмі лёгка стаць чэрствым, не ўспрымальным да чалавечага гора, таму для Валянціна Стэфановіча вельмі важна заставацца спагадлівым для людзей, не згубіць спачуванне да іх. І ў яго гэта атрымліваецца. 13-гадовая праца навучыла стрымліваць эмоцыі, падыходзіць да праблемаў з рацыянальнага боку: што і як можна зрабіць у канкрэтнай сітуацыі, дзейнічаць максімальна хутка і эфектыўна.

З цікавых бакоў — магчымасць вандраваць. Праваабарончы цэнтр «Вясна» з'яўляецца сябрам шэрагу міжнародных арганізацыяў, і таму яго супрацоўнікі маюць магчымасць удзельнічаць у шэрагу міжнародных праваабарончых місій, а таксама ў міжнародных дэлегацыях па назіранні за выбарамі.

Арышт Алеся Бяляцкага Валянцін Стэфановіч (як і многія) лічыць выключна палітычнай справай. Але, у адрозненне ад большасці з нас, у сваіх высновах ён кіруецца не эмоцыямі, а юрыдычнымі нормамі.

Цяжка не пагадзіцца з такімі яго словамі: «Цынізм нашых уладаў заключаецца ў тым, што яны выдатна ведалі, на якія мэты выдаткоўваюцца гэтыя сродкі, яны палявалі за імі ўсе гэтыя гады — іх вельмі цікавілі распіскі, якія людзі пісалі за тое, што ім кампенсавалі штрафы, іншыя пытанні. У юрыдычным сэнсе ў дзеяннях Бяляцкага няма складу злачынства, якое яму цяпер інкрымінуюць. Бо толькі прыбытак, паводле нашых законаў, абкладаецца падаткам, і ні пра якое ўхіленне тут і гаворкі няма».

Як вядома, галоўны сэнс «Гукання вясны» ў тым, каб прыблізіць яе надыход. Першы намеснік праваабарончага цэнтру «Вясна» Валянцін Стэфановіч менавіта гэтым і займаецца. Толькі вясна для яго не прыродная падзея, а палітычная.

# TV ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## 26 ВЕРАСНЯ, ПАНЯДЗЕЛАК

**06.00, 07.10, 08.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**07.05, 08.05** «Зона Х». Дарожныя навіны.
**07.30, 08.25** Дзелавое жыццё.
**08.30** «Завядзёнка». Дак. фільм (НГТРК).
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «На нажах» (Расія).
**11.05** Серыял «Дыхай са мной» (Расія).
**12.10** Баявік «Рызыка без кантракту» (Расія).
**13.45** Сінематэка.
**14.25** Здароўе.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Камедыя «Зануда» (Францыя).
**17.05** Серыял «На нажах» (Расія).
**18.00** Серыял «Дыхай са мной» (Расія).
**18.50** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Арэна.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** Камандзіроўка.
**22.00** Баявік «У тыле ворага» (ЗША).
**00.05** Дзень спорту.
**00.15** Дак. цыкл «У пошуках праўды».

---

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.00** Нашы навіны.
**06.10** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.10** Контуры.
**10.15** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
**12.00** «Краіна цудаў Рыны Зялёнай».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** Тэлечасопіс «Звяз».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Прэм'ера. «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Зваротны адлік».
**19.00** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў «Адкрыты фармат».
**22.10** «Атлантыда». Шматсерыйны фільм.
**23.10** Прэм'ера. «Нона, давай!».
**23.45** «Пражэктарпэрысхілтан».
**00.25** Прэм'ера. «Умовы кантракту». Шматсерыйны фільм.
**01.20** Начныя навіны.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**08.30** «Тыдзень».
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.10** «Зялёны агурок. Карысная перадача».
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Зорны рынг».
**14.45** «Вялікі горад».
**15.20** Канцэрт М.Задорнава.
**16.00** «Я-вандроўца».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічны падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм«Блокпост». Расія, 1998 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Сталічны футбол».
**23.30** «Таямніцы свету з Ганнай Чапман».

---

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**10.10** «Запал і ўлада».
**10.45** Канцэрт Mylene Farmer «Avant que l'ombre.. a Bercy».
**12.45** Рэальны свет.
**13.20** Камедыйны анімацыйны фільм «Кукарача» (Расія).
**14.45** Навіны надвор'я.
**15.15** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**16.20** Медычныя таямніцы.
**16.55** Прыгодніцкі баявік «Снайпер. Зброя адплаты» (Беларусь-Расія). 1-я серыя.
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.00** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**20.05** Беларуская часіна.
**21.05** Калыханка.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Тэлебарометр.
**21.30** Канцэрт Mylene Farmer «Avant que l'ombre. a Bercy».
**23.35** Авертайм.
**00.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.

---

РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**12.25** «Ранішняя пошта».
**12.55** «Пакой смеху».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.35** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.50** Тэлесерыял «Сястры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** «Прамы эфір».
**21.35** Тэлесерыял «Контргульня».
**23.25** Тэлесерыял «Дурнаватая».
**00.15** Навіны - Беларусь.
**00.25** Прэм'ера. «Вынікі. Горад-атрута».

---

НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Праграма Максімум».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00** Сёння.
**10.20** «Рускія сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
**11.10** «Да суда».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.25** Серыял «Абвешчаны ў вышук».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Серыял «Марскія д'яблы».
**21.25** Серыял «Глушэц. Вяртанне».
**23.15** Сёння.
**23.40** «Сумленны панядзелак».
**00.30** Серыял «Сталіца граху».
**01.15** Серыял «Школа».

---

EUROSPORT

**09.30** Матаспартыўны часопіс.
**09.45, 11.00, 01.30** Тэніс. Турнір WTA. Токіо (Японія). Дзень 1.
**14.45** Мотаспорт. Супербайк. Чэмпіянат свету. Італія. 2-я гонка.
**15.30, 19.30** Веласпорт. Чэмпіянат свету. Групавая гонка. Капенгаген (Данія).
**16.30, 20.30** Біятлон. Летні чэмпіянат свету (Чэхія). Спрынт.
**17.30** Біятлон. Летні чэмпіянат свету (Чэхія). Гонка праследу. Жанчыны.
**18.00** Біятлон. Летні чэмпіянат свету (Чэхія). Гонка праследу. Мужчыны.
**18.30** Футбол. Часопіс.
**21.45** Вось дык так!
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**23.30** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. The Battle.
**00.30** Футбол. Часопіс.

---

БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.40** Зона Свабоды.
**08.10** «Акварыум», серыял: 2 серыя.
**09.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**09.15** Беларускія лёсы: «Бізнес-партыя», рэпартаж, 2009 г., Польшча.
**09.40, 14.10** ПраСвет.
**10.05, 12.55** Эксперт.
**10.30** Фільматэка майстроў: «Варажба жарлянкі», маст. фільм, 2005 г., Польшча–Германія.
**12.10** «Васіль Быкаў. Вяртанне», дак. фільм, 2004 г., Беларусь.
**12.30** Беларускія лёсы: «Бізнес-партыя», рэпартаж, 2009 г., Польшча.
**13.20** «Акварыум», серыял: 2 серыя.
**14.40** «Васіль Быкаў. Вяртанне», дак. фільм, 2004 г., Беларусь.
**15.05** Фільматэка майстроў: «Варажба жарлянкі», маст. фільм, 2005 г., Польшча–Германія.
**16.40** Беларускія лёсы: «Бізнес-партыя», рэпартаж, 2009 г., Польшча.
**17.05** «Мой родны горад», серыял.
**17.25** Зона Свабоды.
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Палітычныя забойствы», дак. фільм, 2005 г., Францыя: 3 серыя: «Смяротны запавет міру Магатмы Гандзі».
**18.55** Невядомая Беларусь: «Верасень 1939. Як нас вызвалялі», дак. фільм, 2011 г., Беларусь.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар.
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** Еўропа сёння.
**20.25** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Залатыя горы», дак. фільм, 2005 г., Польшча.
**20.45** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**21.50** «Варажба жарлянкі», маст. фільм, 2005 г., Польшча–Германія.
**23.20** Аб'ектыў.
**23.45** Гарачы каментар.

## 27 ВЕРАСНЯ, АЎТОРАК

**06.00, 07.10, 08.20** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**07.05, 08.05** «Зона Х». Дарожныя навіны.
**07.30, 08.15** Дзелавое жыццё.
**08.25** Арэна.
**08.45** Слова Мітрапаліта Філарэта.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «На нажах» (Расія).
**11.05** Серыял «Дыхай са мной» (Расія).
**12.10** Меладрама «Ты заўсёды будзеш са мной» (Расія).
**14.00** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Мультсерыял «Іван і Мітрафан» (Расія). 1-я серыя.
**15.50** «Эпоха».
**16.45** Серыял «На нажах» (Расія).
**17.55** Серыял «Дыхай са мной» (Расія).
**18.50** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**21.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Баварыя-Манчэстар Сіці. Прамая трансляцыя.
**23.50** Дзень спорту.
**00.05** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд дня.

---

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.10** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.10** «Жыць здарова!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
**12.00** «Умовы кантракту». Шматсер. фільм.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Прэм'ера. «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Каралева экрану». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Новая камедыя «Трохі не ў сабе».
**22.15** «Атлантыда». Шматсерыйны фільм.
**23.15** «Двайняты. Адзін лёс на дваіх».
**00.15** Прэм'ера. «Умовы кантракту». Шматсерыйны фільм.
**01.10** Начныя навіны.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** Фільм «Блокпост». Расія, 1998 г.
**10.10** «Далёкія сваякі».
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** Фільм «Дэкан Спенлі». Вялікабрытанія - Новая Зеландыя, 2008г.
**15.35** «Ваенная таямніца».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічны падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Шанхайскія рыцары». ЗША - Ганконг, 2003 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Таямніцы нараджэння энергіі».
**23.30** «Аўтапанарама».
**23.50** «Падкідны». Серыял.
**00.45** «Жорсткі бізнэс». Серыял.

---

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05** Камедыйны серыял «Інтэрны» (Расія). Заключная серыя.
**10.10** «Запал і ўлада».
**10.45** Рэальны свет.
**11.15** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**12.05** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.
**13.05** Авертайм.
**13.30** Драма «Я абяцала, я сыйду…» (Расія).
**15.10** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**16.15** Медычныя таямніцы.
**16.50** Прыгодніцкі баявік «Снайпер. Зброя адплаты» (Беларусь-Расія). 2-я серыя.
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.00** Хакей. КХЛ. СКА (Санкт-Пецярбург) - Дынама (Мінск).
**21.05** Калыханка.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Тэлебарометр.
**21.30** «Беларуская часіна».
**22.30** Камедыйны серыял «Інтэрны» (Расія). Заключная серыя.
**23.35** Спорт-кадр.
**00.05** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Рэал - Аякс.

---

РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Контргульня».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.35** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.50** Тэлесерыял «Сястры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** «Прамы эфір».
**21.35** Тэлесерыял «Контргульня».
**23.25** Тэлесерыял «Дурнаватая».
**00.15** Навіны - Беларусь.
**00.25** Прэм'ера. Дакументальны фільм.

---

НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Кватэрнае пытанне».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**11.10** «Да суда».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** Серыял «Абвешчаны ў вышук».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Серыял «Марскія д'яблы».
**21.25** Серыял «Глушэц. Вяртанне».
**23.15** Сёння.
**23.40** Футбол. Ліга Чэмпіёнаў УЕФА. «ЦСКА» (Масква) - «Інтэр» (Італія).
**01.35** Серыял «Школа».

---

EUROSPORT

**09.30, 11.00, 18.00** Тэніс. Турнір WTA. Токіо (Японія). Дзень 2.
**14.45** Футбол. Часопіс.
**15.45** Біятлон. Летні чэмпіянат свету (Чэхія). Спрынт.
**17.00** Біятлон. Летні чэмпіянат свету (Чэхія). Гонка праследу. Жанчыны.
**17.30** Біятлон. Летні чэмпіянат свету (Чэхія). Гонка праследу. Мужчыны.
**19.30** Тэніс.
**21.30, 22.00** Бокс.
**00.00** Аўтаспорт. Дарога да Дубаі. Часопіс.
**00.15** Мотаспорт. Супербайк. Чэмпіянат свету. Італія. 2-я гонка.
**00.45** Мотаспорт. Ле Ман 24 гадзіны.
**01.45** Мотаспорт. Суперспорт. Чэмпіянат свету. Італія.

---

БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** «Сузор'е Паўднёвага Крыжа», камедыя, 2001 г., Аўстралія.
**09.10** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**09.30** «Мой родны горад», серыял: 11 серыя.
**09.55** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**10.05** Еўропа сёння.
**10.35** Невядомая Беларусь: «Верасень 1939. Як нас вызвалялі», дак. фільм, 2011 г., Беларусь.
**11.05** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**11.25** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Залатыя горы», дак. фільм, 2005 г., Польшча.
**11.45** «Ранча», серыял: 52 серыя.
**12.35** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**12.45** «Сузор'е Паўднёвага Крыжа», камедыя, 2001 г., Аўстралія.
**14.20** «Мой родны горад», серыял: 11 серыя.
**14.45** Еўропа сёння.
**15.15** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Залатыя горы», дак. фільм, 2005 г., Польшча.
**15.35** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**15.55** Невядомая Беларусь: «Верасень 1939. Як нас вызвалялі», дак. фільм, 2011 г., Беларусь.
**16.25** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Залатыя горы», дак. фільм, 2005 г., Польшча.
**16.50** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**17.00** «Тры шалёныя нулі», серыял: 1 серыя.
**17.25** Вагон.
**17.30** Эксперт.
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Арол», серыял: 9 серыя.
**19.00** Два на два (тэледыскусія).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар.
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** На колах.
**20.30** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**20.40** «Над Нёманам» (тэлечасопіс).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Сальда (эканамічная праграма).
**21.40** Рэпартэр.
**22.10** «Дэтэрмінатар», серыял: 13 серыя.
**22.55** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма).
**23.20** Аб'ектыў.
**23.45** Гарачы каментар.

## 28 верасня, серада

### 1

**06.00, 07.10, 08.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**07.05, 08.05** «Зона Х». Дарожныя навіны.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Сфера інтарэсаў». Эканамічная праграма.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «На нажах» (Расія).
**11.00** Серыял «Дыхай са мной» (Расія).
**12.10** Меладрама «Фота маёй дзяўчыны».
**13.55** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Мультсерыял «Іван і Мітрафан» (Расія). 2-я серыя.
**15.50** «Эпоха».
**16.45** Серыял «На нажах» (Расія).
**17.50** Серыял «Дыхай са мной» (Расія).
**18.50** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Зямельнае пытанне.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**21.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. БАТЭ - Барселона. Прамая трансляцыя.
**23.50** Дзень спорту.
**00.05** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд дня.

### ОНТ

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.10** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.10** «Жыць здорава!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
**12.00** «Умовы кантракту». Шматсер. фільм.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Прэм'ера. «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Каралева экрану». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Новая камедыя «Трохі не ў сабе».
**22.15** «Атлантыда». Шматсерыйны фільм.
**23.15** Асяроддзе пасялення.
**00.15** Прэм'ера. «Умовы кантракту». Шматсерыйны фільм.
**01.10** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** Фільм «Шанхайскія рыцары». ЗША - Ганконг, 2003 г.
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Падкідны». Серыял.
**15.35** «Ніна». Серыял.
**16.50** «Гаворыць і паказвае Мінск».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Падвойная згуба». Расія, 2009 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Дабро пажаліцца».
**23.20** «Падкідны». Серыял.
**00.15** «Жорсткі бізнэс». Серыял.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.00** Моладзевы серыял «Барвіха» (Расія). 1-я серыя.
**10.00** «Запал і ўлада».
**10.35** Канцэрт Stevie Wonder «Soul Life and Live At Last».
**12.15** Рэальны свет.
**12.50** «Халі-Галі». Скетч-шоў.
**13.15** Спорт-кадр.
**13.45** Казка «Марынка, Янка і таямніцы каралеўскага замка» («Беларусьфільм»).
**15.05** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**16.10** Медычныя таямніцы.
**16.45** Прыгодніцкі баявік «Снайпер. Зброя адплаты» (Беларусь-Расія). 3-я серыя.
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.00** Моладзевы серыял «Барвіха» (Расія). 1-я серыя.
**20.00** «Беларуская часіна».
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** «Спортлато 5 з 36».
**21.25** КЕНО.
**21.30** Канцэрт Stevie Wonder «Soul Life and Live At Last».
**23.10** Рэальны свет.
**23.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Марсэль - Барусія (Дортмунд).

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Контргульня».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.35** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.50** Тэлесерыял «Сястры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** «Прамы эфір».
**21.35** Тэлесерыял «Контргульня».
**23.25** Тэлесерыял «Дурнаватая».
**00.15** Навіны - Беларусь.
**00.25** Прэм'ера. «Гістарычны працэс».

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Дачны адказ».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.40** Сёння.
**10.20** «Развод па-руску».
**11.10** «Да суда».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.25** Серыял «Асноўная версія».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.45** Футбол. Ліга Чэмпіёнаў УЕФА. «Зеніт» (Расія) - «Порта» (Партугалія).
**21.45** Серыял «Глушэц. Вяртанне».
**23.05** «Увага: вышук!».
**23.45** Серыял «Сталіца граху».
**00.30** Серыял «Школа».

### EUROSPORT

**09.30** Аўтаспорт. Дарога да Дубаі. Часопіс.
**09.45, 11.00, 18.00, 01.30** Тэніс. Турнір WTA. Токіо (Японія). Дзень 3.
**14.45** Футбол. Клуб Чэмпіёнаў. Часопіс.
**14.55** Тэніс.
**16.00** Артыстычны більярд. Чэмпіянат свету. Фларанж (Францыя). 1/2 фіналу.
**17.00** Артыстычны більярд. Чэмпіянат свету. Фларанж (Францыя). Фінал.
**17.55** Футбол. Клуб Чэмпіёнаў. Часопіс.
**20.00** Самыя моцныя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў (Нідэрланды).
**20.55** Падзея Дыскавары. Формула 1.
**21.00** Абранае па серадах.
**21.10** Навіны коннага спорту.
**21.15** Гольф. Тур PGA. Тур Чэмпіёнаў.
**22.15** Гольф. Адкрыты чэмпіянат Аўстрыі.
**22.45** Гольф клуб. Навіны гольфа.
**22.50** Ветразевы спорт.
**23.20** Ветразевы спорт. Кубак Міжземнамор'я. Барселона.
**23.50** Яхт-клуб. Навіны ветразевага спорту.
**00.00** Тэніс.

### БЕЛСАТ tv

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** «Арол», серыял: 9 серыя.
**08.35** Два на два (тэледыскусія).
**09.00** «Тры шалёныя нулі», серыял: 1 серыя.
**09.25** На колах.
**09.50** Рэпартэр.
**10.20** Сальда (эканамічная праграма).
**10.35** Госць «Белсату».
**10.50** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**11.00** «Над Нёмнам» (тэлечасопіс).
**11.20** «У пошуку ідышу», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**12.50** «Арол», серыял: 9 серыя.
**13.45** На колах.
**14.15** «Тры шалёныя нулі», серыял: 1 серыя.
**14.40** Эксперт.
**15.10** Сальда (эканамічная праграма).
**15.25** Два на два (тэледыскусія).
**15.50** Госць «Белсату».
**16.10** Без рэтушы: «Беларускае золата», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**16.30** Рэпартэр.
**17.00** «Ажыятаж вакол Басі», серыял: 1 серыя.
**17.25** МакраФон: XIV Фестываль песеннай паэзіі і аўтарскай песні «Бардаўская восень–2007»: выступ Лявона Вольскага, ч. 1.
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Дэтэрмінатар», серыял: 13 серыя.
**18.50** Без рэтушы: «Дайсці да Плошчы», дак. фільм, 2011 г., Беларусь.
**19.15** Сальда (эканамічная праграма).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар.
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** Праект «Будучыня».
**20.25** Навігатар.
**20.40** Госць «Белсату».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Без рэтушы: «З крыжам на крыж», дак. фільм, 2010 г., Польшча.
**21.50** «Прыгоды пана Міхала», тэлесерыял: 8 серыя.
**22.15** Два на два (тэледыскусія).
**22.40** Аб'ектыў.
**23.05** Гарачы каментар.

## 29 верасня, чацвер

### 1

**06.00, 07.10, 08.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 00.30** Навіны.
**07.05, 08.05** «Зона Х». Дарожныя навіны.
**07.30, 08.30** Дзелавое жыццё.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «На нажах» (Расія).
**11.05** Меладраматычны серыял «Дыхай са мной» (Расія).
**12.10** Меладрама «Настаўнік музыкі» (Украіна).
**13.55** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Мультсерыял «Іван і Мітрафан» (Расія). 3-я серыя.
**15.50** «Маэстра, музыку…». Дак. фільм.
**16.50** Серыял «На нажах» (Расія).
**17.55** Серыял «Дыхай са мной» (Расія).
**18.50** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** Клуб рэдактараў.
**22.30** Крымінальная прыпавесць «Мяжа кантролю» (ЗША-Японія).
**00.40** Дзень спорту.
**00.55** Дакументальны цыкл «У пошуках праўды» (Украіна).

### ОНТ

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.10** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.10** «Жыць здорава!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
**12.00** «Умовы кантракту». Шматсер. фільм.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Прэм'ера. «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Каралева экрану». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Новая камедыя «Трохі не ў сабе».
**22.15** «Атлантыда». Шматсерыйны фільм.
**23.15** «Несакрэтныя матэрыялы».
**23.45** «Зваротны адлік».
**00.15** Прэм'ера. «Умовы кантракту». Шматсерыйны фільм. Заключныя серыі.
**02.00** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** Фільм «Падвойная згуба». Расія, 2009г.
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Падкідны». Серыял.
**15.35** «Ніна». Серыял.
**16.50** «Мінск і мінчане».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Мечнік». Расія , 2006г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Аўтапанарама».
**23.20** «Падкідны». Серыял.
**00.05** «Жорсткі бізнэс». Серыял.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.10** Моладзевы серыял «Барвіха» (Расія). 2-я серыя.
**10.10** «Запал і ўлада».
**11.15** Канцэрт Bryan Adams «Live In Lisbon».
**12.25** Рэальны свет.
**12.55** Страсці па культуры.
**13.35** Меладрама «Віцька Шушамець і аўтамабіль» (Расія).
**15.00** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**16.05** Медычныя таямніцы.
**16.40** Прыгодніцкі баявік «Снайпер. Зброя адплаты» (Беларусь-Расія). 4-я серыя, заключная.
**17.55** Серыял «Ты маё жыццё».
**18.55** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Лакаматыў - Андэрлехт. Прамая трансляцыя.
**20.55** Моладзевы серыял «Барвіха» (Расія). 2-я серыя.
**21.55** КЕНО.
**22.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Спортінг - Лацыё. Прамая трансляцыя.
**00.00** Час футболу.
**00.45** Рэальны свет.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Контргульня».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.35** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.50** Тэлесерыял «Сястры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** «Прамы эфір».
**21.35** Тэлесерыял «Контргульня».
**23.25** Тэлесерыял «Дурнаватая».
**00.15** Навіны - Беларусь.
**00.25** Прэм'ера. «Паядынак».

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Таямнічая Расія».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Следства вялі…».
**11.10** «Да суда».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** Вострасюжэтны серыял «Асноўная версія».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.35** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.45** Фільм «Служу айчыне!».
**21.40** Дэтэктыўны серыял «Глушэц. Вяртанне».
**22.40** Сёння.
**23.05** Прэм'ера. «Генералы халоднай вайны. Эдуард Шэварнадзэ».
**00.00** Вострасюжэтны серыял «Сталіца граху».
**00.45** Серыял «Школа».

### EUROSPORT

**09.30** Тэніс. Турнір WTA. Токіо (Японія). 1/4 фіналу.
**11.00** Тэніс. Турнір WTA. Токіо (Японія). 1/4 фіналу.
**14.45** Футбол. Клуб Чэмпіёнаў. Часопіс.
**15.00** Артыстычны більярд. Чэмпіянат свету. Фларанж (Францыя). Фінал.
**16.00** Снукер. Мастэрс. Сан-Паула (Бразілія). Фінал.
**17.55** Футбол. Клуб Чэмпіёнаў. Часопіс.
**18.00** Тэніс.
**19.30** Тэніс. Турнір WTA. Токіо (Японія). 1/4 фіналу.
**21.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. The Battle (Новая Зеландыя).
**22.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.
**00.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE (World Wrestling Entertainment).
**00.40** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**01.40** Тэніс. Турнір WTA. Токіо (Японія). 1/4 фіналу.

### БЕЛСАТ tv

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** «Прыгоды пана Міхала», тэлесерыял: 8 серыя.
**08.05** «Дэтэрмінатар», серыял: 13 серыя.
**08.50** «Ажыятаж вакол Басі», серыял: 1 серыя.
**09.15** Праект «Будучыня».
**09.45** «У пошуку ідышу», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**11.15** Госць «Белсату».
**11.30** Без рэтушы: «З крыжам на крыж», дак. фільм, 2010 г., Польшча.
**11.55** Навігатар.
**12.10** Эксперт.
**12.40** «Прыгоды пана Міхала», тэлесерыял: 8 серыя.
**13.05** «Дэтэрмінатар», серыял: 13 серыя.
**13.55** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**14.20** Без рэтушы: «З крыжам на крыж», дак. фільм, 2010 г., Польшча.
**14.40** «Ажыятаж вакол Басі», серыял: 1 серыя.
**15.10** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**15.35** Навігатар (інфармацыйна-публіцыстычны тэлечасопіс).
**15.50** «Над Нёмнам» (тэлечасопіс).
**16.10** Без рэтушы: «З крыжам на крыж», дак. фільм, 2010 г., Польшча.
**16.30** Два на два (тэледыскусія).
**17.00** «Сонечная дзіда», серыял: 5 серыя.
**17.25** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**17.30** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма).
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** Госць «Белсату».
**18.20** «Акварыум», серыял: 2 серыя.
**19.10** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.25** «Бульбаны», мультсерыял.
**20.30** Эксперт.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**21.50** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Цягнік стаіць пяць хвілінаў», дак. фільм, 2009 г., Літва.
**22.50** «Навенькая», дэтэктыўны серыял: 1 серыя. Рэж. Томаш Шафраньскі, 2010 г., Польшча.
**23.35** Аб'ектыў.
**00.00** Гарачы каментар.

## 2 КАСТРЫЧНІКА, НЯДЗЕЛЯ

**06.20** Канцэрт «Залаты грамафон» (2009г.).
**09.00, 12.00** Навіны.
**09.10** Арсенал.
**09.40** Зброя.
**09.55** Фартыфікацыя.
**10.35** Відэафільм АТН «Над Ушачамі восень плыве..» цыклу»Зямля беларуская».
**10.50** «Сваты-4» (Украіна).
**12.10** «Мэры Попінс,да спаткання!» (СССР). 1-я і 2-я серыі.
**15.00** Навіны.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.30** Дакументальны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**16.25** Камедыя «Ванька Грозны» (Расія).
**18.10** Суперлато.
**19.00** Навіны.
**19.15** Крымінальная камедыя «Там, дзе грошы» (ЗША-Германія).
**21.00** У цэнтры ўвагі.
**21.55** Баявік «Моцны арэшак» (ЗША).
**00.15** «Сваты-4». Камедыйны серыял (Украіна).

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь (з субтытрамі).
**09.20** Камедыйны серыял «Мая цудоўная няня».
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.05** «Фазэнда».
**11.40** АНТ прадстаўляе: «Брэйн-рынг».
**12.40** Фільм «Мачаха».
**14.20** Фільм «Прывітанне, маляня!».
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Нядзельны «Ералаш».
**16.30** Асяроддзе пасялення.
**17.30** АНТ прадстаўляе: «Эстрадны кактэйль».
**18.45** АНТ прадстаўляе: «Бітва тытанаў».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Гонар нацыі».
**22.10** «Вялікая розніца».
**23.15** Фільм «Юленька».
**01.05** Фільм «Рэцэпт яе маладосці».

**07.00** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**07.25** Фільм «Бандыты». ЗША, 2001 г.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Дзембельскі альбом» Серыял.
**13.20** «Добры дзень, доктар!».
**13.55** Фільм «Мой ласкавы і пяшчотны звер». СССР - Германія (ФРГ), 1979 г.
**16.00** «Пяць гісторый».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.55** Чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па футболе: ФК «БАТЭ» - ФК «Гомель». Прамая трансляцыя.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Каралі Мамба». ЗША - Францыя , 1992 г.
**22.40** «Прафесійны бокс».
**23.35** Фільм «Палыя анёлы». Ганконг, 1995 г.
**01.20** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

**06.40** Шпіёнская камедыя «Агент 117. Місія ў Рыа» (Францыя).
**08.25** «Правы чалавека».
**08.40** Дабравест.
**09.10** Свет вашай хаце.
**09.20** Тэлебарометр.
**09.25** «Старшыня» (СССР). 1-я і 2-я серыі.
**12.25** Кінаспробы.
**13.00** «Страсці па культуры».
**13.45** Серыял «Маргоша» (Расія).
**17.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Тотэнхэм - Арсенал. Прамая трансляцыя.
**19.55** «Смешная часіна».
**20.25** Навіны надвор'я.
**21.00** Спортлато 5 з 36.
**21.05** КЕНО.
**21.10** Шпіёнская камедыя «Агент 117. Місія ў Рыа» (Францыя).
**23.00** Авантурная камедыя «Пад замком» (Францыя).

**07.00** «ХА». Маленькія камедыі.
**07.20** Фільм «Каханне прыходзіць не адно. 2011 г.
**09.00** Тэлесерыял «Дішнікі. Працяг».
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** Фільм «Толькі ўдваіх».
**13.30** «Смехапанарама».
**14.00** Весткі.
**14.15** «З новай хатай!».
**14.45** «Гарадок». Дайджэст.
**15.15** Прэм'ера. «Прышэльцы. Гісторыя ваеннай таямніцы».
**16.10** Фільм «Сем нявест яфрэйтара Збруева».
**18.05** Прэм'ера. Вялікі святочны канцэрт.
**20.00** Весці тыдня.
**21.05** Прэм'ера. Фільм «Беспасажніца». 2011 г.
**22.55** «Адмысловы карэспандэнт».
**23.55** Фільм «Клінч». 2008 г.

**07.30** Дзіцячая раніца на НТБ-Беларусь.
**08.00** Сёння.
**08.20** «У зоне адмысловай рызыкі».
**08.50** «Першая перадача».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Выратавальнікі».
**10.55** «Дачны адказ».
**12.00** «Развод па-руску».
**13.00** Сёння.
**13.20** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**15.05** «Крамлёўскія дзеці».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Следства вялі…».
**17.20** «І зноў добры дзень!».
**18.30** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.50** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**21.55** Прэм'ера. «Філіп Кіркораў. Мая споведзь».
**22.55** «Нтвшнікі».
**23.55** Вострасюжэтны фільм «Лекара выклікалі?».

**09.30** Снукер. Турнір PTC (Players Tour Championship). Польшча. Дзень 2.
**11.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры (Аўстрыя).
**12.45** Супербайк. Чэмпіянат свету (Францыя).
**13.00** Супербайк. Чэмпіянат свету (Францыя). Заезд 1.
**14.00** Суперспорт. Чэмпіянат свету (Францыя).
**15.15** Аўтаспорт. Аўта ГП. Чэмпіянат свету (Італія). Заезд 1.
**15.45** Аўтаспорт. Аўта ГП. Чэмпіянат свету (Італія). Заезд 1.
**16.30** Супербайк. Чэмпіянат свету (Францыя). Заезд 2.
**17.30** Снукер. Турнір PTC (Players Tour Championship). Польшча. Дзень 3.
**19.00** Мотаспартыўны часопіс.
**19.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры (Аўстрыя).
**20.15** Снукер. Турнір PTC (Players Tour Championship). Польшча. Дзень 3.
**21.00** Снукер. Турнір PTC (Players Tour Championship). Польшча. Дзень 3.
**23.55** Мотаспорт. Лепшае ў серыі DTM. Часопіс.
**00.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры (Аўстрыя).
**01.15** Супербайк. Чэмпіянат свету (Францыя). Заезд 2.
**02.15** Мотаспартыўны часопіс.

**07.00** Аб'ектыў.
**07.15** Зона Свабоды.
**07.45** Госць «Белсату».
**08.00** «Доктар Марцін», серыял: 4 серыя.
**08.50** «Сонечная дзіда», серыял: 5 серыя.
**09.20** Калыханка для самых маленькіх.
**09.45** Чаму дэмакратыя? 2 серыя: «У пошуках рэвалюцыі».
**10.40** ПраСвет.
**11.05** «Трэці афіцэр», дэтэктыўны серыял: 5 серыя.
**11.55** На колах.
**12.25** Два на два (тэледыскусія).
**12.50** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**13.20** «Сонечная дзіда», серыял: 5 серыя.
**13.45** Калыханка для самых маленькіх.
**14.15** Невядомая Беларусь: «Зямля ў палоне», дак. фільм, 2011 г., Беларусь.
**14.40** «Від з дзясятага паверху», 2011 г. , Польшча.
**15.30** «Спадар Забойства», маст. фільм, 1998 г., ЗША: ч. 2.
**17.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.20** «Акварыум», серыял: 3 серыя.
**18.10** Два на два (тэледыскусія).
**18.40** «Три трейлера», дак. фільм, 1998 г., Расія.
**19.05** «Бульбаны», мультсерыял.
**19.20** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**19.40** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** «Палітычныя забойствы», дак. фільм, 2000 г., Францыя: 4 серыя: «Смерць у каланіяльным стылі. Забойства Патрыса Лумумбы».
**20.45** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.40** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**22.10** Фільматэка майстроў: «Непахаваны», маст. фільм, 2004 г., Польшча–Славакія–Венгрыя.
**00.10** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**00.20** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**01.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).

# Шаноўныя чытачы!

**На жаль, газету «Новы час» немагчыма набыць у шапіках або крамах. Няма нас і ў дзяржаўнай сістэме распаўсюду Белпошты. Але можна падпісацца на «Новы час» і кожны тыдзень атрымліваць газету.**

Падпісацца магчыма на любую колькасць месяцаў, аформіўшы банкаўскі ці паштовы перавод і накіраваўшы копію плацёжнага дакументу на адрас рэдакцыі. (Глядзіце ўзоры квітанцый). Нашы рэквізіты: **рахунак 3012741108019 у аддзяленні №539 ОАО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

Акрамя таго падпісацца можна ў нашых рэгіянальных прадстаўнікоў:

Магілёў: (8 029)) 604 34 57, Юрый;
Мінск: (8029) 178 31 68 Вольгв
Бабруйск (8029) 628 75 01 Вольга
Слуцк (8044) 755 66 48 Марына

БЕЛПОЧТА

ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
(почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ______
(почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ______

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______
Время приема ______ ч. _____ мин.
Подпись

## Паважаныя чытачы!

Падпісны кошт аднаго нумара газеты 750 руб. аднаго месяца — 3000 руб.

«Новы час» запрашае да супрацоўніцтва распаўсюджвальнікаў газеты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

**Даведка па тэл: (8 029) 651 21 12.**

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик

Пеня ______

Кассир Всего ______

**Для тых, хто прымае рашэнні!**

Новы час

www.novychas.org

ФЕНОМЕН

# ЧОРНАЯ МЕТКА ДЛЯ СТАРОЙ ПАЛІТЫКІ

Алег НОВІКАЎ

**Галоўнай сенсацыяй выбараў у Берліне, якія адбыліся 18 верасня, стаў прарыў у парламент маладой Партыі піратаў. Дзе хаваюцца прычыны такога поспеху і якія будуць яго наступствы для германскай палітыкі — сёння гэта самыя папулярныя пытанні сярод нямецкіх палітычных аглядальнікаў.**



Спачатку пра тых, каму ў Берліне не пашанцавала. Галоўнымі лузерамі берлінскіх выбараў, безумоўна, сталі лібералы. Свабодная дэмакратычная партыя (FDP) атрымала сімвалічныя 1,8 працэнта. Чаму сімвалічныя? Таму што тры гады таму на федэральных выбарах у свабодных дэмакратаў было 18 працэнтаў. Філіп Рослер — лідар партыі — пакуль не знайшоў формулу рэанімацыі FDP.

У мінусе і нямецкія сацыял-дэмакраты (SPD), якіх на выбары вёў бургамістр Клаус Ваверайт, аўтар славутай фразы: «Я гей, і што ў гэтым кепскага?». Хаця ружовыя засталіся вядучай партыяй у сталіцы (SPD мае 28 працэнтаў) і перамаглі Зялёных, якія нейкі час усур'ёз разлічвалі паспрачацца з эсдэкамі за крэсла мэра, вялікай эйфарыі тут не назіраецца. Праблема ў тым, што вельмі нізкія паказчыкі мае партыя Левых (11 працэнтаў), якая апошняе дзесяцігоддзе была кааліцыйным партнёрам эсдэкаў. Тое, што Левыя — партыя былых камуністаў ГДР — здаюць пазіцыі, цікавая тэма. Відавочна, што настальгія па сацыялізму ва Усходняй Германіі паступова сыходзіць. А іншай базы, акрамя пенсіянераў, у Левых няма.

З-за слабых вынікаў Левых, сфармаваць кааліцыю з імі ўжо не атрымаецца. Ваверайту патрэбна шукаць новага саюзніка. Выбар невялікі. Гэта або хрысціянскія дэмакраты, якія атрымалі 23 працэнта (што для традыцыйнага левага Берліну вельмі някепска). Або Зялёныя, якія прыйшлі да фінішу з 17 працэнтамі. З першымі Ваверайту яўна не па дарозе: у выпадку блоку з партыяй Меркель, цяперашняе падзенне рэйтынга канцлера абавязкова аукнецца эсдэкам. Застаюцца Зялёныя, з якімі ў Клауса вельмі няпростыя адносіны. Усю кампанію менавіта эколагі і іх лідар Рэната Кунаст

> Зялёныя, як вядома, таксама пачыналі як вулічная партыя, якая, аднак, здолела паступова пазбавіцца хіпоўскіх прымочак і зарэкамендаваць сябе як сур'ёзны палітычны гулец

былі галоўным аб'ектам крытыкі сацыял-дэмакратаў. У іх бачылі галоўных канкурэнтаў. Цяпер трэба мірыцца. Што тычыцца саміх Зялёных, то ім, здаецца, пакуль не да кааліцыйных перамоваў. Яны, як, дарэчы, і іншыя, спрабуюць зразумець: што рабіць з «піратамі»?

Маладая Партыя піратаў, якая зрабіла сабе імя на тэме барацьбы з цэнзурай і аўтарскім правам у інтэрнэце, з 9 працэнтамі падтрымкі прарвалася ў берлінскі парламент. Такога трыумфу не чакалі нават самі аранжавыя (партыйны колер Партыі піратаў). У некаторых акругах сталіцы пасля галасавання ўзнікла праблема: «піраты» выставілі занадта мала кандыдатаў. Паколькі яны атрымалі на парадак больш, цяпер яны вымушаны хутка шукаць жадаючых папрацірацьштаны ў мясцовых саветах.

На папярэдніх выбарах у берлінскі сенат Партыя піратаў удзелу не брала. Такім чынам, аранжавыя здолелі стварыць сваю электаральную базу за пяць гадоў, прычым з нуля. Сацыёлагі ўжо склалі партрэт прыхільнікаў аранжавых. Гэта, перш за ўсё, тыя, хто звычайна галасуе за малыя партыі, і тыя, хто ўвогуле ніколі па розных прычынах не галасаваў. Плюс катэгорыя тых, хто здрадзіў партыям, за якія аддаваў голас раней.

Больш за ўсё ад такога партыйнага адзюльтэру пакутуюць Зялёныя. Яны недалічыліся 17 тысяч галасоў. У эсдэкаў «піраты» «скралі» 14 тысяч выбаршчыкаў. У Левых — 13 тысяч.

Варта таксама згадаць, што «піраты» — практычна партыя мужчын. З 15-ці чалавек «пірацкай» фракцыі ў берлінскай ратушы толькі адна жанчына. Такая мужчынская дамінацыя дае сатырыкам падставу, каб іранізаваць над праграмнымі лозунгамі піратаў. На думку шмат каго, за барацьбой супраць цэнзуры ў сеціве хаваецца банальнае жаданне вольна праглядаць порнасайты.

Між тым, палітолагі спрабуюць зразумець, што здарылася 18 верасня і як берлінскі казус можа паўплываць на больш глабальныя палітычныя трэнды.

Што тычыцца прычын такога фенаменальнага ўзлёту піратаў, то большасць звязвае яго з такой з'явай, як пратэстнае галасаванне супраць старых партый. «Гэта класічны выпадак пратэстнага галасавання», — сцвярджае Ангела Меркель. Аналітыкі бачаць тут подых арабскай вясны і апошніх моладзевых пратэстаў у Іспаніі, Грэцыі і Вялікабрытаніі.

Іншыя, наадварот, пішуць, што «піраты» ўхапілі нерв новай генерацыі, якая літаральна «паехала» на розных кампутарных феньках. Палітыкі старой генерацыі, у сваю чаргу, абыякава ставяцца да новых трэндаў і, адпаведна, не выглядаюць у вачах юніёраў сваімі. Так, аказалася, што той жа Ваверайт не ведае, што такое смартфон. Вялікі пласт аналітыкі прысвечаны новым формам палітычнага піяру, які выкарыстоўвалі «піраты». Напрыклад, яны здолелі прыцягнуць на свой бок нямецкую блогасферу, якая пачала асацыяваць сябе з праектам.

Акрамя таго, усе старыя партыі дзейнічаюць у выразных рамках эстэтыкі мінулага стагоддзя. Так, тыя ж Зялёныя выкарыстоўваюць культурны код 1980-х, калі ў ФРГ быў папулярны антыатамны рух. Піраты першымі ў сваім агітпропе зрабілі стаўку на эстэтыку моладзевай субкультуры новага стагоддзя.

Яшчэ адна версія прычын прарыву «піратаў» — берлінская спецыфіка. Сапраўды, у Берліне асобная ўнікальная гарадская культура, складовай часткай якой з'яўляюцца творчыя эксперыменты. Адсюль і яе палітычны прадукт у выглядзе Партыі піратаў. Відавочна, што аўтары гэтай канцэпцыі не бачаць для «піратаў» вялікіх перспектыў.

Падобным чынам лічаць і тыя, для каго «піраты» — выключна партыя эпізадычнага пратэсту. Падчас дэбатаў з апанентамі яны звычайны згадваюць вопыт Зялёных. Зялёныя, як вядома, таксама пачыналі як вулічная партыя, якая, аднак, здолела паступова пазбавіцца хіпоўскіх прымочак і зарэкамендаваць сябе як сур'ёзны палітычны гулец.

Аднак, у адрозненні ад Партыі піратаў, у тагачасных Зялёных была нейкая ідэйная платформа. Зялёныя першай хвалі былі пастантыаўтарытарнымі левымі. Сістэма адзіных каштоўнасцяў, сапраўды, слабае месца ў партыі са сцягам з выявай вясёлага Роджэра. На старце праекту ў Партыю піратаў запісваліся нават карычневыя. Дэфіцыт адзінства, як лічаць скептыкі, пацягне за сабой унутрыпартыйныя канфлікты. Працэс будзе яшчэ больш дынамічным з-за абсалютнай некампетэнтнасці большасці новаабраных піратаў-дэпутатаў.

На базе такіх прагнозаў сярод сяброў класічных партый нават узнік забаўны тэзіс: можа, і добра, што «піраты» перамаглі зараз, за два гады да федэральных выбараў. Да 2013 года яны цалкам сябе скампраметуюць і не змогуць парушыць алгарытм нямецкай палітыкі.

Аптымісты могуць супрацьставіць скептыкам толькі адно — газетныя нататкі першай паловы 1980-х, прысвечаныя Зялёным. Эколагаў спачатку таксама дружна лічылі палітычнымі прафанамі, і нават наркаманамі. Плюс аналіз тэндэнцый у грамадстве.

«Мы папросту не разумеем, што час змяніўся. Схема «правыя — левыя» больш не працуе. Прыйшоў час новых, постідэалагічных партый, так званых партый радыкальных цэнтрыстаў. І «піраты» сталі першай нямецкай партыяй новага тыпу», — піша газета «Tageszeitung».

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Дзякуючы цесным сувязям з Расіяй Мінск атрымаў шэраг эканамічных (у першую чаргу энергетычных) прэферэнцый, якія дазволілі Лукашэнку згубіць значныя дэмакратычныя дасягненні Беларусі першых гадоў яе незалежнасці. Дыктатар ператварыў краіну ў жывы музей СССР. Ён гадамі ўмела лавіраваў паміж ЕС і Расіяй, пагражаючы Маскве, што далучыцца да Захаду, а Брусэлю — зваротным сцэнарам. Ён жадаў толькі падоўжыць знаходжанне ва ўладзе, таму ён бязлітасна парушае правы чалавека і душыць апазіцыю. Але і Захаду, і Расіі Лукашэнка ўжо надакучыў, і ён апынаецца ва ўсё большай ізаляцыі. Лукашэнку ўсё больш пагражае лёс маскоўскага мэра, і каб пазбегнуць гэтага, ён вінаваціць Крэмль у тым, што той здрадзіў ідэі адраджэння СССР. Нядаўна ён нават прапанаваў апазіцыі сесці за «круглы стол». Расія і ЕС заклікаюць апошняга дыктатара Еўропы сысці на пенсію, але Масква асцерагаецца, што яго пераемнік можа пайсці шляхам Малдавіі, ці таго горш — Грузіі.

**«Polityka» (Польшча)**

У Расіі з'явіўся сур'ёзны канкурэнт. Кітай цікавяць у Беларусі шмат у чым тыя ж актывы, што і РФ.

Найперш гэта «Беларуськалій» і машынабудаўнічыя прадпрыемствы. Пры гэтым Пекін з золатавалютнымі рэзервамі, якія перавышаюць 3 трыльёна долараў, плацежаздольней за Маскву. Агрэсіўная фінансавая падтрымка беларускай эканомікі з боку КНР значна абвострыць канкурэнцыю падчас прыватызацыі і з вялікай верагоднасцю пацягне выцясненне расійскіх удзельнікаў з прыватызацыйнай гонкі. Неафіцыйна расійскія службоўцы таксама прызнаюць, што магчымая канкурэнцыя з боку кітайцаў можа зблытаць Маскве ўсе карты ў гульні з Мінскам.

**«Коммерсантъ» (Расія)**

Па меркаванні экспертаў, да рэальнага масавага пратэсту беларусы яшчэ не саспелі. Сярод абывацеляў сёння найболей папулярны анекдот пра тры ўзроўні беднаты беларуса: грошай няма, грошай няма зусім і час здаваць долары. Гледзячы на ажыятаж у абменных пунктаў, назіральнікі канстатуюць надыход трэцяга з іх. Пра масавыя акцыі можна будзе казаць тады, калі беларусы праядуць свае заначкі. Па ацэнках экспертаў, гэта можа здарыцца ўзімку.

**«Независимая газета» (Расія)**

Эвалюцыя стаўлення расіян да беларусаў — гэта яшчэ і следства эканамічнага ціску Масквы на Мінск у крызіс. Раней прадстаўнікі абедзвюх нацый мелі кантакты на роўных. Расіяне ў рэгіёнах зараблялі прыкладна столькі ж, а беларусы не так ужо часта ездзілі са сваёй утульнай краіны на заробкі ў «кашмарную» Расію. Зараз да беларусаў сталі ставіцца, як да таджыкаў, узбекаў і іншай «чэрні». Усё гэта далёка не бяскрыўдна. Узровень напругі ў беларускім грамадстве ў цэлым расце. Апытанні паказваюць, што шараговыя беларусы ўсё больш скептычна ставяцца да перспектывы ўступлення РБ у склад Расіі, і нават у цяперашніх эканамічных умовах кажуць: «Не трэба нас ператвараць у Пскоў ці Смаленск». Хтосьці не жадае гразі, хтосьці — каставага грамадства, у якім правы заўсёды той, у каго больш правоў. А хтосьці проста ўпэўнены, што з прыходам «братоў-каланізатараў» жыць стане горш.

**«Ростбалт» (Расія)**

Беларуская апазіцыя дачакалася ад Літвы другога ўдару пад дых: спачатку службоўцы Міністэрства юстыцыі дапамаглі А. Лукашэнку засадзіць у турму дысідэнта і праваабаронцу А. Бяляцкага, а зараз і сама прэзідэнт Д. Грыбаўскайтэ беларускіх апазіцыянераў назвала стаўленікамі Масквы. Вуснамі Грыбаўскайтэ казаў сам А. Лукашэнка. Пасля такога пляўку, які пакрыў ганьбай усю Літву, дэмакратычнаму свету толькі і застаецца думаць, што выдача беларускіх апазіцыянераў Міністэрствам юстыцыі была заканамернай, можа нават загадзя спланаванай — службоўцы проста паводзілі сябе так, як падабаецца літоўскаму прэзідэнту.

**«Lietuvos rytas» (Літва)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ГРЭЦЫЯ. ЯШЧЭ АДЗІН СЯБРА МЫТНАГА САЮЗУ?

Сябры Валгаградскай грэчаскай абшчыны прапанавалі свой рэцэпт выратавання эканомікі Грэцыі. У адмысловым звароце, падрыхтаваным для парламента Грэцыі, валгаградскія грэкі прапанавалі сваёй гістарычнай радзіме стаць сябрам Мытнага саюзу Расіі, Беларусі і Казахстана. «Мы прапануем у выпадку выключэння Грэцыі з еўразоны выступіць з ініцыятывай далучэння грэчаскай дзяржавы да Мытнага саюза Расіі, Беларусі і Казахстана. Упэўнены, што Масква, Мінск і Астана падтрымаюць такую просьбу і не пакінуць Грэцыю сам-насам са сваімі праблемамі», — гаворыцца ў заяве. Самае смешнае, што расійскія аналітыкі ўсур'ёз лічаць, што ініцыятыва валгаградскіх грэкаў можа выклікаць інтарэс у Афінах, і больш таго — будзе на ўра ўспрынятая ў Брусэлі. «Сёння ўзнікае пытанне прывабнасці супрацоўніцтва з Расіяй і міжнародных праектаў, якія прасоўваюцца ёю. Ідэя антыкрызіснага вымярэння Мытнага саюза, ды яшчэ ў прывязцы да ЕЎрасаюза, можа выклікаць цікавасць у еўрапейскай грамадскай думцы і, адпаведна, палепшыць замежнапалітычны імідж Расіі», — разважае адзін з расійскіх аналітычных сайтаў.

**Па матэрыялах расійскай прэсы**

### УКРАІНА. ПЕРШАЯ КНІГА ПРА ДАНЕЦКУЮ РЭСПУБЛІКУ

Ва Украіне выйшла першая навуковая праца пра гісторыю Данецка-Крываарожскай рэспублікі. «Данецка-Крываарожская рэспубліка: Расстраляная мара». Кніга — спроба распавесці пра незвычайнае дзяржаўнае фармаванне. У 1918 годзе, падчас наступу немцаў, якія займалі Украіну ў рамках падпісанай у тым ліку бальшавікамі Брэсцкай дамовы, Масква спрабавала чыніць ім адпор рукамі армій быццам незалежных мясцовых рэспублік, да якіх быццам не мела ніякага дачынення. Адной з такіх рэспублік была Данецка-Крываарожская рэспубліка (ДКР), якая праіснавала пару месяцаў. Доўгі час ДКР была вядомая хіба гісторыкам. Пакуль у 1990-я гады ў Данбасе не ўзнік Інтэрфронт, які выступаў супраць незалежнасці Украіны. Яго стваральнікі адразу выцягнулі на святло міф па ДКР як доказ таго, што Данбас быў далучаны да Украіны гвалтоўна. Міф пра ДКР карыстаўся папулярнасцю сярод лідараў Партыі рэгіёнаў. Праект стварэння Паўднёва-Усходняй украінскай аўтаномнай рэспублікі ў час аранжавай рэвалюцыі таксама ідэйна звязвалі з ДКР. Відавочна, што выхад першай манаграфіі пра ДКР яшчэ больш узмацніць данецкі сепаратызм. Праўда, не выключана, што яна будзе мець адваротны эфект. Па-сутнасці відавочна, што ДКР была не фабрыкай данбаскай дзяржаўнасці і не антыўкраінскім праектам, а рэспублікай-марыянеткай, якая цалкам падпарадкоўвалася Маскве.

**Па матэрыялах украінскай прэсы**

### БЕЛЬГІЯ. АКЦЫІ ФЛАМАНДСКІХ НАЦЫЯНАЛІСТАЎ

Апошнія плёткі пра тое, што партыі, якія засядаюць у бельгійскім парламенце, усё ж могуць сфармаваць нацыянальны ўрад, мабілізавалі радыкальную фракцыю фламандскіх нацыяналістаў. Менавіта яны апошнія паўтара гады сабатавалі працэс стварэння кабінету, мяркуючы, што ўрадавы крызіс паспрыяе падзелу краіны на дзве дзяржавы — Фландрыю і Валонію. Такая тактыка, сапраўды, падклала бомбу пад фундамент бельгійскай дзяржавы. Некаторыя нават ужо казалі пра хуткае ўключэнне франкамоўнай Валоніі ў склад Францыі. І вось цяпер напалеонаўскія планы фламандскіх нацыяналістаў разбураюцца. Найбольш незадаволеныя ўльтраправыя з партый Фламандскі блок і Новы фламандскі альянс. 18 верасня ў адным з прыгарадаў Брусэля яны сабралі каля 5 000 сваіх прыхільнікаў, якія патрабавалі «пакончыць з імперыялізмам франкафонаў і заклікалі «валонскіх пацукоў пакаваць чамаданы». Не абышлося без інцыдэнтаў — лідары Фламандскага блоку і Новага фламандскага альянсу ўчынілі бойку з-за мікрафона. Нягледзячы на камічнасць сцэны, паліцыя лічыць, што сітуацыя вельмі напружаная, паколькі агрэсіўны нацыяналізм можа перакінуцца на трыбуны футбольных стадыёнаў. Адзін з матчаў бельгійскай лігі ўжо даваўся прыпыніць з-за сутычак паміж фламандскімі і валонскімі фанатамі.

**Па матэрыялах «Le Monde» (Францыя)**

### ГЕРМАНІЯ. ДЭПУТАТЫ СУПРАЦЬ РЫМСКАГА ПАПЫ



Прыезд у Германію Рымскага папы выклікаў незвычайную актыўнасць з боку дэпутатаў Бундэстага ад левых партый. Ужо ўзнікла ініцыятыва байкатаваць выступ пантыфіка ў парламенце. Яе падтрымалі ўсе дэпутаты ад фракцыі партыі Левых, а таксама некаторыя парламентарыі ад Зялёных і сацыял-дэмакратаў. Пры гэтым яны спасылаюцца на пункт статуту Бундэстага, які забараняе запрашаць у парламент лідараў канфесій. Такім чынам, запрашэнне Папы на трыбуну парламента, на думку дэпутатаў-атэістаў, не што іншае, як парушэнне закону аб нейтральнасці дзяржавы ў справах рэлігіі. На гэтым пратэсты не заканчваюцца. Каля ста дэпутатаў падалі заяву на правядзенне ў сталіцы антыклерыкальнай маніфестацыі, якую ўзначаляць правадыры ўсё тых жа Левых. Бенедыкт XVI, нагадаем, у час трохдзённага візіту наведае Берлін, Эрфурт і Фрайбург.

**Па матэрыялах нямецкай прэсы**

---

▸ **ПАДРАБЯЗНАСЦІ**

# СТРАЙК У ПУСТЫНІ

**У Казахстане — самая вялікая забастоўка ў нацыянальнай гісторыі. Пачынаючы з мая бастуюць нафтавікі Мангышлаку. Пра падрабязнасці забастоўкі, пра рэакцыю ўлады і грамадства на страйк журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з казахскім журналістам Рынатам Сайдуліным.**



***— З-за чага пачалася забастоўка?***

— Пратэсты ў нафтавай галіне — самыя працяглыя за ўсю гісторыю Казахстана — пачаліся ў маі, калі працоўныя запатрабавалі падвышэння заработнай платы і стварэння незалежных прафсаюзаў, паколькі не давяралі афіцыйным. Калі кіраўніцтва іншаземных кампаній — уладальнікі прадпрыемстваў — праігнаравала іх патрабаванні, некаторыя нафтавікі абвясцілі галадоўку. Яна выклікала, у сваю чаргу, страйк салідарнасці, які хутка перарос у бестэрміновы страйк. Называюцца розныя лічбы пратэстуючых — ад 2 да 12 тысяч. Мяркую, бастуе каля пяці тысяч чалавек.

***— Які сацыяльны стан сярэдняга казахскага нафтавіка?***

— Перш за ўсё варта згадаць, што ўяўляе Мангышлак. Усе прадукты тут — прывазныя, улетку — спякота за сорак градусаў, узімку — маразы, круглы год — пясчаныя буры. Таму заробкі тут заўсёды былі вышэй, чым у сярэднім па рэспубліцы. Самі нафтавыя кампаніі, на якіх ідзе страйк, сістэматычна скідаюць у медыя прэс-рэлізы, у якіх прыводзяць разлікі заробкаў нафтавікоў, якія відавочна перавышаюць сярэднестатыстычныя паказчыкі па Казахстане — да 1500–2000 долараў ЗША. Але нават гэтыя высокія заработныя платы атрымліваюць толькі высокакваліфікаваныя супрацоўнікі — абслуговы і тэхнічны персанал зарабляе ў два–тры разы менш, а якраз яны і складаюць касцяк страйкоўцаў. У сярэднім зарплата нафтавіка на Мангышлаку каля 60 тысяч тэнге (прыкладна 410 долараў ЗША) у месяц.

***— Як бачым, забастоўка пачыналася пад сацыяльнымі лозунгамі. Чаму ўлада не ўмяшалася ў канфлікт і не ўрэгулявала яго?***

— Першапачаткова патрабаванні пратэстуючых былі, сапраўды, выключна сацыяльныя і эканамічныя. Увогуле, яны датычацца адносін калектываў з кіраўніцтвам розных кампаній. Аднак казахстанскія ўлады спрыялі ўзмацненню напружанасці, паколькі аказаліся не ў стане адразу ўрэгуляваць пытанні і не даводзіць справу да канфрантацыі, а таксама дазволіўшы паліцэйскі гвалт супраць рабочых. За два месяца, на працягу якіх у Заходнім Казахстане праходзяць страйкі і галадоўкі нафтавікоў, ніхто з дэпутатаў казахстанскага парламента так і не знайшоў час, каб сустрэцца з пратэстуючымі. У выніку акцыя пратэсту, якая пачыналася як вузкая і лакалізаваная, пачала набываць палітычны фармат. Так, каля 3000 нафтавікоў адмовіліся ад сяброўства ў прэзідэнцкай партыі «Нур Атан». Падобны сыход з партыі ў Казахстане мае сімвалічнае значэнне. У дадатак у справу ўмяшаліся апазіцыйныя партыі Казахстана, што надало сітуацыі палітычную афарбоўку.

***— Як вядома, міжнародны розгалас страйкаў прывёў да таго, што брытанскі рок-спявак Стынг адмяніў ліпеньскі канцэрт у сталіцы Казахстана Астане. Як самі ўлады рэагавалі на ўчынак музыкі?***

— Сапраўды, гэта быў шок для ўлады. Уся Астана была завешана плакатамі напярэдадні прыезду Стынга. Ён быў цвіком святочнай праграмы ў гонар дня нараджэння Назарбаева. І раптам канцэрт адмяняецца. Афіцыйныя крыніцы ў Казахстане спачатку сцвярджалі, што выступы адменены па тэхнічных чынніках. Пасля ўзнікла новая версія. Рашэнне адмяніць канцэрт звязалі з інтрыгамі збеглых казахстанскіх алігархаў. Аднак праўду схаваць цяжка. Людзі віталі ўчынак рок-зоркі. У брытанскае пасольства сталі пісаць лісты, каб Стынг публічна асудзіў нейкія іншыя несправядлівасці, якія адбываюцца ў краіне. У інтэрнэце ўзнікла нават ініцыятыва за тое, каб абраць Стынга прэзідэнтам Казахстану.

***— Ці змянілася тактыка ўлады пасля таго, як забастоўка набыла больш выразны палітычны фармат?***

— Маштаб і працягласць пратэстаў, відавочна, былі для ўлады сюрпрызам. Спатрэбіўся нейкі час, каб улада прыйшла ў сябе і пачала дзейнічаць. Вырашылі адказаць суровымі мерамі. З пачатку страйку было звольнена прынамсі 400 працоўных. У двух выпадках узброеная дубінкамі паліцыя ўварвалася ў лагер пратэстуючых. 2 жніўня быў знойдзены забітым прафсаюзны актывіст Жаксылык Турбаеў. Дагэтуль у паліцыі няма падазраваных. 8 жніўня Наталля Сакалова, юрыст прафсаюза, была асуджана на шэсць гадоў турмы за «распальванне сацыяльнай нянавісці». 16 жніўня лідар незалежнага прафсаюза Акжанат Амінаў атрымаў год пазбаўлення волі ўмоўна. Меў месца падпал хаты намесніка прафсаюзу, а таксама збіванне невядомымі жонак нафтавікоў.

***— Рэпрэсіі зламалі нафтавікоў?***

— Не. Яны проста замацавалі распаўсюджаную думку пра тое, што ўрад займае процілеглы бок у гэтым канфлікце. Пратэсты працягваюцца. Кожны дзень на плошчы перад адміністрацыяй гораду, дзе жывуць нафтавікі, працягваюць збірацца да тысячы бастуючых працаўнікоў. З наступам вячэрняй прахалоды колькасць мітынгуючых павялічваецца ў некалькі разоў.

***— Як падаецца забастоўка ў афіцыйных медыя?***

— Пачалася прапагандысцкая кампанія супраць акцыі. Навязваецца думка, што нафтавікі пратэстуюць пад уплывам вонкавых сіл. Быццам іх выкарыстоўвае апазіцыя для нейкіх сваіх вузкіх палітычных планаў. Пужаюць тым, што ў нафтавікоў, якія не атрымліваюць зарплату на працягу 2–3 месяцаў, абавязкова пачнуцца праблемы ў сям'і. Распаўсюджваюцца дзікія чуткі. Напрыклад, пра тое, што нафтавікі ў якасці сродку ціску на ўлады вырашылі не адпускаць сваіх дзяцей 1-га верасня ў школу. У СМІ даюць словы шматдзетным маці, ветэранам вайны і працы, якія крытыкуюць забастоўшчыкаў. Кшталту, як можна кінуць працу, на якой працаваў, выйсці на вуліцу і спакойна разваліцца пад дрэвамі ў цяньку?! Быццам забастоўка — гэта «добрая нагода» нічога не рабіць. Аднак такая кампанія мае слабы эфект.

***— Якія перспектывы рашэння канфлікту?***

— Тое, што доўгае супрацьстаянне паміж бастуючымі працаўнікамі нафтавай галіны Казахстана і кіраўніцтвам карпарацый зайшло ў тупік, здаецца, прызнаюць усё — і самі забастоўшчыкі, і працадаўцы, і ўлады. Але ніводны з бакоў не жадае ісці на саступкі. Асабліва гэта тычыцца ўлады. Перамога нафтавікоў можа стаць сігналам для іншых працоўных калектываў. Дастаткова згадаць, што ўлетку, нягледзячы на шантаж і запалохванне ўлады ў падтрымку забастоўшчыкаў Мангышлаку выступілі калектывы шэрагу буйных прадпрыемстваў. Напрыклад, самая вялікая ў краіне горнарудная кампанія «АрселорМіттал Тэміртау». Заявы рабочых утрымліваюць не толькі словы салідарнасці, аднак і прэтэнзіі — нізкая і няроўная аплата, дрэнныя ўмовы працы, пераслед прадстаўнікоў незалежных прафсаюзаў.

РЭФОРМА

# ЛАМА ІДЗЕ НА ПЕНСІЮ



Алег НОВІКАЎ

**Тыбецкі рух напярэдадні кардынальнай трансфармацыі. Далай-лама перадаў частку паўнамоцтваў новаму лідару эміграцыйнага ўраду.**

Яшчэ ў далёкія 1960-я гады, калі цяперашні 14-ы Далай-лама толькі збег з захопленага камуністамі Тыбету ў Індыю, ён пачаў казаць пра рэформу тыбецкай мадэлі дзяржавы. Апошняя, як вядома, будуецца на прынцыпе выканання царквой яшчэ і адміністратыўных функцый. Гэта значыць, што вышэйшая духоўная асоба, Далай-лама, з'яўляецца адначасова кіраўніком дзяржаўнай вертыкалі. Далай-лама выступіў за падзел дзяржавы і царквы шляхам стварэння свецкага ўраду, які б, у дадатак, абіраўся дэмакратычным галасаваннем.

Нягледзячы на тое, што Далай-лама мае абсалютную ўладу над тыбетцамі і можа патрабаваць усё, што заўгодна, яго мара рэалізавалася толькі амаль праз паўстагоддзя. У красавіку гэтага года раскінутая па ўсім свеце тыбецкая дыяспара абірала прэм'ера эміграцыйнага ўраду, які на мове тыбетцаў называецца калон-трыпа (Kalon Tripa). Кандыдатаў было трое, а перамог 43-гадовы юрыст-міжнароднік Лобсанг Сангай. За яго прагаласавала 55 працэнтаў выбарцаў.

У жніўні Сангай урачыста прыняў прысягу і заступіў на пасаду калон-трыпа, чыя рэзідэнцыя, як вядома, знаходзіцца ў індыйскім гарадку Дхарамсале. Гэты горад перадаў тыбецкім уцекачам яшчэ сам Джавахарлал Неру. Цяпер Лобсанг і яго ўрад займаюцца адміністратыўным блокам, а Далай-лама — духоўным накірункам.

Гістарычны акт аддзялення царквы ад дзяржавы не выклікаў у тыбецкай супольнасці прыліву аптымізму. Хутчэй, наадварот. Лобсанг як лідар Далай-ламе моцна прайграе. Ён нарадзіўся ў 1968 годзе ў сям'і эмігрантаў і ніколі не быў на радзіме продкаў. Яго біяграфія — хутчэй кар'ера паспяховага юрыста. Адзінай гераічнай старонкай тут з'яўляецца хіба што гісторыя шлюбу. Лобсанг паходзіць з беднай сям'і, аднак здолеў дабіцца рукі дзяўчыны, якая належыць да вядомага арыстакратычнага роду. Больш таго, прайшоў адбор на статус мужа, змагаючыся з іншымі прэтэндэнтамі-арыстакратамі.

Пасля заканчэння ўніверсітэту ў Дэлі, Лобсанг падаўся ў ЗША, і праз нейкі час стаў першым з тыбетцаў (увогуле, на зямлі іх каля сямі мільёнаў), які атрымаў дыплом Гарвардскага ўніверсітэту. Акрамя вучобы, ён займаўся арганізацыяй розных канферэнцый з удзелам Далай-ламы, працаваў у моладзевых азіяцкіх арганізацыях, напісаў кнігу пра Тыбет. Вось з такім жыццёвым багажом ён і стаў правадыром тыбецкай нацыі.

Хаця саму працэдуру дэмакратычнага абрання тыбецкая супольнасць вітала, скептыцызму наконт прэм'ерства Лобсанга хапае. Каментатары пагаджаюцца, што без аўтарытэту Далай-ламы і маштабу яго персоны, інтарэс да тыбецкага пытання ў свеце можа рэзка паменшыцца. Самому руху пагражае частковая маргіналізацыя, паколькі новы прэм'ер, у адрозненні ад Далай-ламы, не з'яўляецца ўваходным у элітныя палітычныя салоны.

Сыход Далай-ламы можа значыць і рэвізію канцэпцыі тыбецкага вызвольнага руху. Як вядома, у сярэдзіне 1980-х Далай-лама навязаў яму прынцып адмаўлення ад гвалту. Раней тыбетцы не сароме́ліся пісаць у Вашынгтон грантавыя заяўкі на вядзенне партызанскай барацьбы супраць Мао. На тэрыторыі Злучаных Штатаў знаходзіліся цэнтры для тыбецкіх камандас.

Не выключана, што за адсутнасцю Далай-ламы пацыфізм зноў саступіць месца радыкальнай тактыцы супраціву. Экстрэмісцкія настроі, сапраўды, вельмі папулярныя сярод маладой генерацыі тыбецкіх эмігрантаў. Гэта людзі, якія выраслі ў сучасным грамадстве і адмаўляюцца шукаць кампраміс з несправядлівым светам праз малітвы. Моду на радыкалізм надаюць навіны з гістарычнай радзімы, дзе адбываецца хуткі працэс культурнай асіміляцыі і каланізацыі краю. Шмат хто баіцца, што праз пару дзясяткаў гадоў кітайскія каланісты будуць у Тыбеце ў большасці. Сам тыбецкі нацыяналізм у такім выпадку згубіць перспектыву аднаўлення сваёй дзяржаўнасці іператворыцца ў рух у абарону гістарычных культурных помнікаў. У гэтым плане адна з самых вялікіх задач новага прэм'ера — наладзіць дыялог паміж старымі і маладымі актывістамі, не даць знікнуць гуманістычнай спадчыне цяперашняга Далай-ламы.

Таксама не варта чакаць ад Лобсанга прарываў у адносінах з КНР. Ён прыйшоў на пасаду прэм'ера ў цяжкі для Тыбету час. Калі верыць праваабарончым арганізацыям, зараз у кітайскіх турмах самая вялікая за ўсю гісторыю колькасць тыбецкіх палітвязняў. Гэта непасрэдны вынік беспарадкаў у Лхасе ў 2008 годзе. З улікам напружанасці ў суседнім Уйгурскім раёне, рэжым у Тыбеце застаецца жорсткім. Тыя ж праваабарончыя арганізацыі інфармуюць пра нядаўнія затрыманні прадстаўнікоў інтэлектуальнай эліты.

Аднак зараз Лобсангу, думаецца, не да перамоваў. Існуе пагроза легітымнасці яго ўраду. Яна, так ці інакш, трымаецца на фігуры Далай-ламы — апошняга лідара фактычна незалежнага Тыбету.

Аднак Далай-лама не вечны. Яму больш за 75 гадоў. Паводле правіл, пасля смерці Далай-ламы манахі арганізуюць пошукі яго наступнай інкарнацыі, маленькага дзіцяці, які павінен валодаць нейкімі прыкметамі гуру і прайсці тэсты. Пошук займае звычайна некалькі гадоў. Затым дзіця праходзіць навучанне пад кіраўніцтвам дасведчаных лам. Асноўную ролю ў прызнанні Далай-ламы гуляе Панчэн-лама — другая асоба ў тыбецкім будызме.

З Панчэн-ламамі зараз поўная катавасія. Увесну 1995 года Далай-лама абвясціў новым Панчэн-ламай шасцігадовага Гендуна Чокы Ныму. Кітайскі ўрад неадкладна адрэагаваў, і «прызначыў» на гэту пасаду іншае дзіця — Г'ялцэна Нарбу.

Каб абраць патрэбнага Панчэн-ламу, кітайскія знаўцы будызму знайшлі ў старых кнігах цікавы рытуал. Аказваецца, Панчэн-ламу можна абіраць у абыход капрызаў Далай-ламы. Яго можна абіраць метадам латарэі. Такая практыка ўпершыню была ўжытая ў XVIII стагоддзі. Прозвішча кандыдатаў пішуць на паперы і кідаюць у спецыяльную залатую урну, якую круцяць перад статуяй Буды ў галоўным храме, пакуль адтуль не выпадзе прозвішча шчасліўца.

Кітайскія ўлады ўхапіліся за гэту папраўку, і хуценька арганізавалі Лама-лато. У лістападзе 1995 годзе выбар паў на Г'ялцэна Нарбу. Хаця хлопчык нарадзіўся ў 1990 годзе, ён ужо абраны віцэ-прэзідэнтам асацыяцыі будыстаў Кітаю і, больш таго, фармальна засядае ў дзяржаўных органах КНР, якія адказваюць за міжканфесіянальныя сувязі.

Што тычыцца Гендуна Чокы Нымы, то ён быў узяты «пад ахову» ўладамі КНР, а яго месцазнаходжанне з тых часоў невядома. Ён, дарэчы, лічыцца самым маладым палітычным вязнем у свеце.

З улікам крызісу інстытуту Панчэн-ламы, нікому не зразумела, як будзе абірацца наступны Далай-лама. Цяперашні, калі верыць прэсе, зараз праводзіць шматлікія кансультацыі з рэлігійнымі спецыялістамі, у пошуках выхаду з патавай сітуацыі са сваім духоўным пераемнікам. Ад гэтага рашэння, відавочна, будзе залежыць будучыня ўсяго тыбецкага руху за незалежнасць.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### НУРСУЛТАН НАЗАРБАЕЎ



Прэзідэнт Казахстана стаў персанажам дзіцячых казак: у Алма-Аце выйшла серыя кніжак «Мой прэзідэнт», «Елбасы — Нурсултан» і «Залатыя яблыкі Дарыгушы» (усе творы напісала пісьменніца Роза Акбулатава). У кніжках у форме дзіцячых апавяданняў расказваецца біяграфія прэзідэнта. Пры гэтым выкарыстоўваюцца шматлікія жанравыя прыёмы, характэрныя для казак. Так, напрыклад, гаворыцца пра цудоўныя знакі, якія суправаджалі нараджэнне будучага прэзідэнта Казахстана: у час яго нараджэння «зашумела трава, зазіхацелі зоркі, неба было ў буйных вялікіх зорках». Прадметы, з якімі гуляе Нурсултан, надзяляюцца чароўнымі якасцямі, ён можа размаўляць з жывёламі і раслінамі і г.д. Цікава, што кніга таксама разлічана на замежную аўдыторыю. Яна выйшла ў перакладзе на англійскую мову. Цяжка сказаць, ці будуць бацькі ў Вялікабрытаніі ці ЗША чытаць дзецям пра прыгоды казачнага Назарбаева. У Казахстане ж рэакцыя на такія казкі з боку бацькоў неадназначная. Адзін з наведвальнікаў інтэрнэт-форуму піша: «Усім, хто ёсць, мазгі прамылі. Зараз за замбаванне дзяцей узяліся. Крый Божа, калі майму дзіцяці гэту ахінею ў дзіцячым садзе прачытаюць».

### ЛЕАПОЛЬДА ЛОПЕС



40-гадовы лідар венесуэльскай апазіцыі афіцыйна пачаў кампанію за абранне прэзідэнтам краіны. Выбары ў Венесуэле прызначаны на кастрычнік 2012 года. Хаця, фармальна, адзіны кандыдат ад апазіцыі будзе названы па выніках праймерыз, які правядуць апазіцыйныя партыі ў лютым наступнага года, шансы Лопеса стаць адзіным лічацца вельмі высокімі. У свой час на выбарах мэра ён збіраў да 80 працэнтаў галасоў. Яго самая вялікая праблема на гэтым этапе — забарона на ўдзел у выбарах. У 2008 годзе суд пазбавіў яго актыўнага выбарчага права да 2014 года за растрату публічных фондаў. Лопес быццам праматаў іх падчас знаходжання на пасадзе мэра гораду Чакао. Сам Леапольда лічыць, што той вердыкт суду парушае канстытуцыю, і гатовы давесці гэта ў рамках новага судовага працэсу. Ён таксама не мае сумневаў, што з'яўляецца тым самым палітыкам, які зможа не пусціць Чавеса на трэці прэзідэнцкі тэрмін. Пра гэта сведчаць, на яго думку, вынікі апошніх рэгіянальных выбараў, на якіх апазіцыя сумарна набрала 52 працэнта галасоў супраць 48, якія былі пададзеныя за партыю Уга Чавеса.

### ЁХАНА ШМІДТ-НІЛЬСЭН

Ёхана зрабіла фантастычную кар'еру ў палітыцы, асабліва з улікам свайго ўзросту (ёй 27 гадоў). Сёння яна самы папулярны палітык у краіне, і часткова дзякуючы ёй кааліцыя левых партый здолела 15 верасня перамагчы кансерватараў. Кар'ерным трамплінам для яе стаў выступ на палітычным шоў «Kaffeevorspiel», куды яе запрасілі ў якасці экзотыкі (яе партыя Чырвона-зялёны альянс збірала на выбарах не больш за 2 працэнты). Аднак Ёхана выступіла так, што адразу стала надзвычай папулярнай. Пунктаў ёй дадаў той факт, што калісьці яна з групай феміністак змагалася супраць буйных выдавецтваў, якія выдавалі парнаграфічныя часопісы. У выніку буму вакол Ёханы больш салідныя левыя партыі, кшталту сацыял-дэмакратаў, пагадзіліся на тое, каб менавіта маладая дзяўчына ўзначаліла адзіны выбарчы спіс дацкіх левых. Цяпер Ёхана — сябар парламенту, і не выключана, што нават атрымае партфель міністра ў новым кабінеце.



▸ УЗГАДАЦЬ УСЁ

# НАПЯРЭДАДНІ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

## 20 ГАДОЎ

Неўпрыкмет падзеі сучаснасці, творцамі і ўдзельнікамі якіх былі і ёсць мы самі, адыходзяць у гісторыю. І разам з тым пакрысе забываюцца. Вось ужо 20 гадоў на сусветнай мапе значыцца суверэнная Рэспубліка Беларусь. Дата, якую ўлады па сутнасці праігнаравалі, хаця апошнім часам, пасля дзесяцігоддзя несупыннай інтэграцыйнай рыторыкі, толькі і цвердзяць аб сабе як аб гарантах гэтай незалежнасці. Іх маўчанне красамоўней іх прапагандысцкай мальбы. Тое была не іх незалежнасць. Але яна была і ёсць — наша незалежнасць, наша Беларусь.

«Новы час» пачынае публікацыю серыі нарысаў Алега Новікава аб пражытых гадах у незалежнай Беларусі, пакуль аўтарытарнай, што на пакручастым шляху да Беларусі дэмакратычнай. Шлях яшчэ не завершаны. Тым больш неабходна ўзгадаць усё, каб не забыцца, не звыкнуцца і ўрэшце дайсці, дайсці да Беларусі.

**Аляксей Кароль**

**АЛЕГ НОВІКАЎ**

**Кампартыя БССР напярэдадні абвяшчэння незалежнасці ўяўляла сапраўдны феномен. Галоўнай рысай ПКБ было ўпартае нежаданне яе кіраўніцтва ўбачыць рэаліі. Здаецца, тагачасныя партыйныя бонзы разглядалі вынікі сакавіцкага рэферэндуму наконт захавання СССР як пачатак заходу перабудовы і літаральна дыхалі хуткім рэваншам.**

Яны сталі такімі смелымі, што нават пачалі дазваляць сабе дражніць старэйшага брата: так, у ПКБ крытыкавалі Гарбачова за тое, што адноўлены СССР, адпаведна праекту, будзе называцца Саюз Суверэнных Дзяржаў. А куды ж падзелася слова «сацыялістычных» не маглі датумкаць на Карла Маркса, 38, дзе месціўся партыйны ЦК. З той жа оперы — патранаж канферэнцыі прыхільнікаў антыгарбачоўскай бальшавіцкай платформы ў ліпені 1991 года. Канферэнцыя закончылася патасоўкай: бальшавікі фізічна прымусілі журналістаў устаць, калі загучаў «Інтэрнацыянал».

Часам артадоксія камуністаў пераходзіла ўсе ліміты разумнага. Адзін з партыйных прапагандыстаў падзяліўся на старонках «Гродненской правды» адкрыццём: палякі Гродзеншчыны маюць асаблівы ген, іншы за ген палякаў карэнных польскіх зямель. Не менш арыгінальнай была аргументацыя камуністаў таго, што людзей Курапатах расстрэльвалі не байцы НКУС, а немцы. Увага звярталася на вялікі памер ботаў у ахвяраў, рэшткі якіх знайшлі ў курапацкіх магілках. Як пісала газета «Мы и время», такія вялікія боты маглі насіць толькі партызаны, паколькі абутак такіх памераў вельмі зручны, каб «пераносіць у іх затворы, перадаючыя механізмы і нават кулямётныя стужкі».

Між тым, пакуль апаратчыкі вылічалі ген палякаў, камунізм губляў пазіцыю за пазіцыяй. За першую палову 1991 года са складу КПСС выйшла 10 працэнтаў сталічнага партактыву. Працоўныя калектывы кшталту МАЗу адмаўлялі пярвічкам партыі і камсамолу ў арэндзе памяшканняў. Самы феерычны выпадак з гэтага шэрагу адбыўся ў Воршы. Там Аляксей Аўдзеенка, камсамольскі сакратар аднаго з заводаў, дамогся, каб усе камсамольцы падпарадкаванай яму арганізацыі напісалі дзве заявы. Першая — пра выхад з ВЛКСМ, другая — з просьбай прыняць іх у шэрагі Канфедэрацыі анархістаў-сіндыкалістаў. Усе 300 камсамольцаў заводу выканалі загад камсорга. Такога трыумфу ідэй Бакуніна і Крапоткіна зямля беларуская яшчэ ніколі не бачыла. Застаецца дадаць, што адміністрацыя заводу не даравала Аўдзеенку яго ўчынак. Неяк яго падлавілі ў выцвярэзніку і на гэтай падставе звольнілі з прадпрыемства.

Маналіт шэрагаў камуністаў імкліва разыходзіўся па ўсіх швах. Увесну ў Вярхоўным Савеце БССР з'явілася група крамольнікаў — «Камуністы за дэмакратыю», — якой кіраваў адзін вядомы пасля палітык. Канфлікт унутры партакратыі быў яшчэ больш відавочны, калі ўзгадаць, што адбывалася ў правінцыі. У Навагрудку пасля 5-гадзінных курсаў па беларускай мове, якія арганізавала мясцовая суполка ТБМ, гаркам КПБ у поўным складзе перайшоў на справаводства па-беларуску.

Жнівеньскі путч 1991-га цалкам пасаваў уяўленням кіраўніцтва камуністаў пра пажаданае развіццё падзей у краіне. Нічога дзіўнага, што яны дружна падтрымалі каманду Язава-Пугі. Як сведчылі высновы парламенцкай камісіі аб падзеях 19–21 жніўня, падтрымка ГКЧП насіла з боку ПКБ сістэмны арганізаваны характар. Часам камуністы нават спрабавалі перашкодзіць дзейнасці выбраных органаў, якія не прызналі пераварот. Таму на хвалі агульнай нянавісці да путчыстаў 28 жніўня КПБ была пазбаўлена рэгістрацыі, хаця пры гэтым адказным супрацоўнікам дазвалялася сядзець у сваіх кабінетах. Так ці інакш, з-за дэфіцыту палітычнай гнуткасці кампартыйнай вертыкалі на чале з сакратаром ЦК Малафеевым і старшынёй Вярхоўнага Савета Дземянцеем Беларусь аказалася адной з нешматлікіх рэспублік СССР, дзе былая партыйная эліта не здолела пасля 19-га жніўня перафарматавацца і захаваць уладу.

Камуністычная агрэсіўная большасць — так называлі самую вялікую фракцыю ў ВС — аказалася ў падвешаным стане. Асаблівых палітычных ідэй, акрамя рэфлексу выжывання, у дэпутатаў не было. На гэтым этапе фракцыя вырашыла тактычна блакавацца з цэнтрыстам Шушкевічам. 17 верасня падчас выбараў новага спікера ВС Кебіч, асноўны праціўнік Шушкевіча, зняў сваю кандыдатуру, і Станіслаў Станіслававіч юрыдычна стаў кіраўніком краіны.

Пакт з Кебічам хутка каштаваў яму сяброўства з дэмакратамі. Апошнія пачалі пінаць Шушкевіча за адсутнасць канцэпцыі развіцця незалежнасці, эканамічныя правалы. У выніку гэта прывяло да стварэння на базе БНФ ініцыятыўнай групы па правядзенню рэферэндуму наконт даверу да ўраду і прызначэнні датэрміновых выбараў.

Думаецца, што якраз з незалежнасцю ў тандэма Шушкевіч—Кебіч усё было добра. Нават, калі б яны нічога не рабілі, працэсы ў суседзяў аб'ектыўна прымушалі іх рухацца ў гэтым накірунку. У якасці прыкладу — гісторыя з увядзеннем нацыянальнай валюты. Спачатку Кебіч і чуць не хацеў пра нейкія талеры, увядзення якіх настойліва патрабаваў БНФ. Пакуль Літва не абвясціла пра пераход з 1 лістапада на рынкавыя кошты. Напярэдадні «гадзіны Х» у Беларусь уварваліся орды літоўскіх пакупцоў, набываючы ўсе, што можна. Пісалі, што ў бамжоў нават перакупалі пустыя посуд. Пра намер вызваліць кошты хутка абвясцілі і Расія.

Каб неяк абараніць унутраны рынак, 15 лістапада ўрад абвясціў пра ўвядзенне з новага года купонаў. Пасля з'явілася інфармацыя пра тое, што маскоўская фабрыка Дзяржзнак надрукуе для Беларусі партыю спецыяльных рублёў, якія будуць хадзіць выключна на нашым рынку. Нарэшце, у снежні міністры перасталі смяшыць людзей і пачалі кансультацыі з англічанамі наконт друку беларускіх грошаў.

Такім жа чынам, як з валютай, атрымалася і з суверэнітэтам. Дата падпісання новай саюзнай дамовы, парафіравацьякую афіцыйны Мінск (у тым ліку і новы спікер Станіслаў Шушкевіч) проста ірваўся, адкладалася і пераносілася. Суб'екты агароўскага працэсу відавочна перасварыліся (Ельцын нават абяцаў рэвізію межаў паміж рэспублікамі). Сваё слова сказаў і канфлікт паміж расійскім і савецкім гарантамі. Уся восень прайшла ў атмасферы нявызначанасці. Пакуль 1 снежня ва Украіне не прайшоў рэферэндум. Прагаласаваўшы за незалежнасць, украінцы паставілі крыж на Савецкім Саюзе, які без Украіны мала хто ўяўляў. Папулярны каментатар Галіна Айзенштадт напісала ў той дзень: «Цяпер Беларусі няма куды падзецца. Яна асуджана на будаўніцтва сваёй суверэннай дзяржавы». Прагноз спраўдзіўся праз 10 дзён у Віскулях, дамову падпісалі з беларускага боку Кебіч і Шушкевіч. Дарэчы, адным з першых рашэнняў С. Шушкевіча як кіраўніка цяпер ужо незалежнай беларускай дзяржавы была адмова жыць у рэзідэнцыі ў Драздах.

Канчатковы выбар на карысць незалежнасці актывізаваў дыс-


БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

СВАБОДА

НІЯКАЙ ПАДТРЫМКІ ХУНЬЦЕ!

АПАЗЫЦЫЯ ПАТРАБУЕ СКЛІКАНЬНЯ СЭСІІ





Мікалай Дземянцей, старшыня ВС БССР 1990–1991

кусію па пытанню, ці патрэбны краіне прэзідэнт. Дэмакраты заяўлялі, што прэзідэнт — гэта шлях да дыктатуры.

Тыя, хто падтрымліваў прэзідэнцкую рэспубліку, узгадвалі дзяржаўны лад ВКЛ. На іх думку, правіцелі ВКЛ фактычна былі прэзідэнтамі, толькі называліся вялікімі князямі.

Пакуль ішлі дэбаты, матэрыялізаваліся першыя кандыдаты. Піянерам, які адкрыта пачаў казаць пра прэзідэнцкія амбіцыі, быў забыты цяпер Вячаслаў Якоўчык, 34-гадовы былы інжынер з тураўскага леспрамгасу. З працы Вячаслава звольнілі яшчэ ў 1987 годзе. Аднак Якоўчык аказаўся моцным арэшкам. Каб адваніцца на працоўным месцы ён, па яго словах, 80 разоў дамагаўся сустрэчы з прэзідэнтам СССР. Пасля вырашыў сам стаць прэзідэнтам. У лістападзе былы інжынер апублікаваў свой зварот да беларускага народа. Цікава, што падчас сустрэч з журналістамі першае, што рабіў Якоўчык, — дэманстраваў даведку з Міжнароднага незалежнага цэнтру па псіхатэрапіі.

Калі ў галіне дзяржаўнага будаўніцтва ўсё развівалася ў правільным накірунку, то ў эканоміцы сітуацыя была жахлівая. Ад студзеня да жніўня 1991 года вытворчасць тавараў народнага спажывання скарацілася на 15 працэнтаў, харчовых — на 8 працэнтаў. Без працы стаяла трэць прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці. Узнікла праблема недапаставак. Увосень спыніўся МТЗ.

Дэфіцыт набываў шалёныя маштабы. Прэса сцвярджала, што ў сталоўцы Дома ўраду, як і ва ўсіх закусачных, таксама пачалі знікаць шклянкі. У інстытутах студэнтам выдавалі па тры сшыткі на канспекты па ўсіх прадметах. У крамах масава пачалі раскупляць савецкія цягі на тканіну. У Гомельскім універмагу, напрыклад, за адзін кумач прасілі 13 рублёў 13 капеек, што трошкі насцярожыла кліентаўвернікаў.

Рэлігія, дарэчы, таксама ўскосна стала чыннікам крызісу. Менавіта на вернікаў адміністрацыя сталічнага метро пераклала адсутнасць манет. Тут з 1 снежня прыпынілі размен папяровых грошаў. Манеты зніклі быццам бы з-за таго, што кааператыўшыкі рабілі з іх крыжыкі.

У такой сітуацыі яўна губляліся былыя арыенціры і каштоўнасці. Фарсіраваны пераход да рынкавай эканомікі аслабіў веру ў яе хараство. Загучалі першыя ноткі настальгіі па савецкіх часах. Упершыню на сценах з'явіліся графіці кшталту «Слава ГКЧП». У снежні адрадзілася Кампартыя, у групе лідараў якой узнікаюць фігуры харызматычнага Валерыя Шчукіна і наменклатурнага Сяргея Калякіна, шлях якога ў апазіцыю на той час прадбачыць было вельмі цяжка.

Аднак сур'ёзнай грамадскай альтэрнатывай лозунг вяртання ў СССР ужо не стане. Пад уплывам масавай культуры фармавалася новая жыццёвая філасофія з устаноўкай на тое, што кожнаму абавязкова выпадае шанец. Не дзіўна, што вялікі інтарэс у грамадства выклікаў план выхаду з крызісу, які прадставіў увосень сацыял-дэмакрат Саўчанка. Ён прапанаваў Кебічу хутка стварыць беларускі флот і дасылаць яго лавіць краба для Японіі, дзе ён каштуе 24 долары за тону. Аднак Кебіч пайшоў іншым шляхам. 19 снежня намеснік прэм'ера Мясніковіч заявіў, што 1 студзеня 1992 года кошты на прадукты вырастуць у 3–4 разы. Пры гэтым прыватызацыі, аднак, не планавалася. Ну, ці не рымейк Кебіча, ужо прэм'ера, мы наглядаем сёння. Праўда, ужо пад размовы аб прыватызацыі.

Агульны шок ад навіны пра новыя цэны трошкі развеяў Уладзімір Вольфавіч Жырыноўскі, які прыехаў напрыканцы снежня ў Мінск і ўмудрыўся на працягу аднаго дня справакаваць дзве вулічныя бойкі плюс даць скандальнае інтэрв'ю праграме «Крок». Там ён, у прыватнасці, паабяцаў распраўіцца з беларусамі, як калісьці гэта рабілі немцы. Усё грамадства дружна рынулася асуджаць выхадку лідара ЛДПР. Пад гэтую тэму і сустрэлі 1992 год — год чорнай малпы.

МАЙСТРЫ

# СВЕТ ЗАХАПЛЕННЯЎ СЯМ'І КАЎРЫГАЎ

Лявон ЦЕЛЕШ

**Некалі беларускія вёскі славіліся сваімі майстрамі. Амаль кожны жыхар вёскі меў навыкі цяслярства, мог пабудаваць хату, зладзіць печ. Майстэрства гэтае перадавалася ў спадчыну.**



Павел Каўрыга

Саветызацыя, калектывізацыя, русіфікацыя, урбанізацыя, алкагалізацыя зрабілі сваю чорную справу. Вёскі пусцеюць, выміраюць на вачах, а выдатных майстроў амаль і не засталося. Але ёсць на Беларусі такія людзі, якія зберагаюць і сваю родную мову, і ўсё, што звязана з мінулым.

З Паўлам Антонавічам Каўрыгам, дацэнтам геаграфічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта, я знаёмы больш за 40 гадоў, з тых часоў, калі мы абодва былі студэнтамі гэтага факультэта. Павел Каўрыга — высокакваліфікаваны спецыяліст і педагог, яго паважаюць і студэнты, і выкладчыкі факультэта. З таго часу, як у 1990 годзе беларуская мова стала дзяржаўнай, і па сённяшні дзень Павел Каўрыга выкладае студэнтам свае прадметы толькі на роднай мове. Размаўляе пабеларуску і дома, і са знаёмымі. Таму не выпадкова, што ён быў узнагароджаны дыпломам і медалём Аркадзя Смоліча «За шанаванне роднага краю», дыпломам Таварыства беларускай школы, прэміяй імя акадэміка Вацлава Ластоўскага для беларускіх выкладчыкаў. Ён — аўтар шматлікіх падручнікаў для студэнтаў па метэаралогіі і кліматалогіі, рыхтуюцца да выдання яго фізгеаграфічныя слоўнікі.

А вось аб тым, што ён яшчэ выдатны этнограф і краязнаўца, я даведаўся зусім нядаўна. Сустрэўся я з Паўлам і яго жонкай Людмілай Васільеўнай на свяце, прысвечаным 120-годдзю Максіма Багдановіча, у Ракуцёўшчыне. Там і прапанаваў нам з жонкай наведаць свой этнаграфічны сямейны музей, які месціцца ў іх на лецішчы, недалёка ад вёскі Краснае.

За сваё жыццё я наведаў шэраг краязнаўчых музеяў, але такой багатай калекцыі прылад сялянскага побыту XIX–XX, і нават XVII (!) стагоддзяў я больш нідзе не сустракаў. Прычым амаль усе экспанаты дасталіся яму і яго сям'і ў спадчыну ад дзеда, Аляксандра Вікенцьевіча Ермалковіча, майстра на ўсе рукі. Дзед Саша, як ласкава называе яго Павел Каўрыга, будаваў дамы, клаў печы, шыў боты, рабіў брычкі. Аб яго майстэрстве ведалі далёка за межамі Маладзечаншчыны. Шмат каму ён пабудаваў хаты, а каля печак, зробленых яго рукамі, і сёння грэюцца людзі. А яшчэ дзед Саша разводзіў розныя гатункі ружаў, пасадзіў вялікі сад. Пражыў ён 102 гады.



Экспанаты музея знаходзяцца адразу пры ўваходзе ў дом. Ля ганку — жорны, якім каля 100 гадоў, і на якіх можна яшчэ змалоць муку. На першым паверсе дома — кошыкі з каранёў яліны, усялякія драўляныя дзежачкі, лубкі. На другім паверсе ўвагу прыцягваюць розныя канфігурацыі прасы, якія зрабіў дзед Саша. Яго ж рукамі выраблены і шматлікія бразготкі ці шархуны. Тут жа і вупраж, хамут, боты, якія ён пашыў з цялячай скуры. Ля сцяны стаіць драўляны ложак. А колькі ў музеі рубанкаў, розных станкоў: і ткацкі, і прадзільны, і такарны.

Па шматлікіх прыладах працы, якія знаходзяцца ў музеі, можна прасачыць лёс традыцыйнай на Беларусі культуры — лёну: тут і пранік, якім адбівалі зярняткі ад снапа, і мяліца, на якой «мялі» льнотрасту, і часалка, і калаўроты. Трэба бачыць, з якой вялікай любоўю і павагай Павел Каўрыга паказвае кожны экспанат музея. А іх больш за сто. Самы старажытны — сячкарня — знаходзіцца ў садзе. Як сведчыць літы надпіс на яе корпусе, выраблена яна была ў Лондане ў 1675 годзе. На працягу больш чым 300 гадоў яна служыла продкам дзеда і яму самаму. Яшчэ і зараз знаходзіцца ў выдатным рабочым стане: Павел Каўрыга бярэ пук саломы і дэманструе яе работу. Сапраўды, рэжа салому, быццам новая.

Побач з сячкарняй — прыгожая брычка, таксама работа дзеда Сашы. Дзве драбіны яе аздоблены палосамі. А на сядзенні фурманкі — чучалы амаль сапраўдных, у натуральную велічыню, дзеда і бабы ў беларускіх строях. Гэтых персанажаў з вялікай любоўю выканала жонка Паўла, Людміла Васільеўна.

Лёс паслаў Паўлу жонку з вялікім густам і ўмелымі рукамі. Усе пакоі хаты ўпрыгожаны яе пано з саломкі, вышытымі пейзажамі, дарожкамі і сурвэткамі. З высокім мастацтвам Людмілай Васільеўнай выкананы абраз Маці Божай «Замілаванне». Звяртае на сябе ўвагу герб «Пагоня», зроблены з саломкі. Гэты герб яна змайстравала за адну ноч, у 1990 годзе.

Людміла Васільеўна нарадзілася ў Пінску, скончыла Беларускі політэхнічны інстытут. А любоў да рукадзелля ёй з дзяцінства заклала маці, якая і прала, і вязала, і вышывала.

У спадчыну Паўлу Каўрыгу перайшлі не толькі дзедавы рэчы, але і яго майстэрства. У сям'і Каўрыгаў — двое сыноў, Аляксандр і Юрый, ёсць і ўнукі — Максім і Мікіта. Так што ёсць каму з цягам часу перадаць багатую спадчыну.

Захапленне напаўняе жыццё сям'і Каўрыгаў сэнсам, а з хатнім унікальным музеям знаёмяцца не толькі родныя і блізкія, але і ўсе зацікаўленыя людзі.

ЗГАДКА

# ЗАБЫТАЯ СПЯВАЧКА ЯЎГЕНІЯ ЧАРНЯЎСКАЯ-ОРСА

Сяргей ЧЫГРЫН

**Слаўная спявачка нашай Бацькаўшчыны. Так у 1930-х гадах называлі маладую беларускую спявачку Яўгенію Чарняўскую-Орса.**

Яўгенія Чарняўская была родам з Навагрудчыны. У сярэдзіне 1930-х гадоў вучылася ў Варшаўскай кансерваторыі. Сваю вучобу і жыццё ў Варшаве маладая студэнтка і спявачка актыўна сумяшчала з беларускім рухам у польскай сталіцы. Без яе ўдзелу не абыходзіліся ні адна беларуская вечарына, сустрэча, прэзентацыя. У Варшаве Яўгенію Чарняўскую ведалі не толькі беларусы, але і ўкраінцы, палякі, літоўцы. Усіх яна зачароўвала сваёй прыгажосцю і голасам.

11 снежня 1937 года ў Варшаве ўкраінская студэнцкая грамада ладзіла вечарыну ў гонар сваёй нацыянальнай паэткі Лесі Украінкі. На вечарыну ўкраінцы запрасілі і Яўгенію Чарняўскую-Орса. Спявачка выканала некалькі ўкраінскіх песень і сваім звонкім мілагучным голасам, як пісаў



часопіс «Шлях моладзі» (1937, № 17. С.18), «здабыла сабе гучныя воплескі шматлікіх слухачоў».

Запрашалі нашу спявачку ўкраінцы Варшавы і на іншыя імпрэзы. Напрыклад, 6 снежня 1938 года яна спявала песні на вечары ўкраінскай паэзіі. А пасля выканання песні «Салавейка» спявачку некалькі разоў выклікалі «на біс». Заходнебеларуская прэса пісала: «Воплескам не было канца. І не дзіва: голас спявачкі прыгожы, тэхніка адпаведная, інтэрпрэтацыя высокакультурная, глыбокая, шчыра адчутая, сцісла гарманізуецца са створанай кампазіцыяй. Выклікае вялікую ўвагу дыкцыя пясняркі. Чарняўская агулам выканала сваё заданне вельмі добра. Можна спадзявацца, што Чарняўская будзе вялікай спявачкай нашай Бацькаўшчыны (Шлях моладзі, 1938. С.20).

6 лютага 1937 года ў Варшаве ў зале імя М. Карловіча мясцовай філармоніі адбыўся беларускі канцэрт-вечарына. Невялікая зала, якая была разлічана толькі на 250 месцаў, змагла ўмясціць больш за 400 чалавек. Многія не змаглі ўжо купіць білетаў.

Канцэрт пачаўся каля 22 гадзін. Першай выступіла беларуская спявачка Яўгенія Чарняўская-Орса. Яна праспявала песні «Адна, і зноў адна», «А за ліхімі ды марозамі» і «Маладая Беларусь». Музыку да гэтых песень напісаў кампазітар Канстанцін Галкоўскі. Спявала Яўгенія і дуэтам з А. Панько. Аб гэтым пісаў у часопісе «Шлях моладзі» (1937, № 3. С. 20) Пятро Ластаўка. Паведамляў усё той жа Пятро Ластаўка і пра іншыя выступленні Яўгеніі Чарняўскай-Орса.

4 сакавіка 1938 года Яўгенію Чарняўскую-Орса на канцэрт у Вільню запрасіў Рыгор Шырма і прапанаваў ёй выступіць разам з яго хорам. Канцэрт адбыўся ў гасцінным універсітэцкай зале Снядэцкіх. У праграме канцэрта так і было запісана, што адбудзецца канцэрт беларускага хору Рыгора Шырмы і маладой беларускай спявачкі Яўгеніі Чарняўскай-Орса. На гэтым канцэрце пабываў і Максім Танк. У сваіх «Лістках календара» (Максім Танк. Збор твораў у шасці тамах. Мн., 1981. Т.6. С. 192) пісаў: «Быў на канцэрце студэнцкага хору Рыгора Шырмы. У другой частцы канцэрта выступала маладая і вельмі сімпатычная спявачка А. Орса-Чарняўская (маецца на ўвазе Аўгіння — С. Ч.). Адкуль яе выкапаў дзядзька Рыгор? І не толькі выкапаў, а і ўзбагаціў яе рэпертуар беларускімі народнымі песнямі. Яна выканала некалькі новых песняў, і асабліва ўдала — «Паднімайся з нізін, сакаліна сям'я…». І яе праводзілі бурнымі апладысментамі; студэнты падарылі ёй прыгожы букет жывых кветак і сэрца кірмашнага «Казюка».

Там Максім Танк упершыню і пазнаёміўся з прыгожай беларускай спявачкай. Іх разам нават Янка Шутовіч сфатаграфаваў. «Сёння (маецца на ўвазе 5 чэрвеня 1938 года — С. Ч.) Я. Шутовіч перадаў мне некалькі фатаграфій: адна — любіцельская — зробленая на казюкоўскім фэсце, дзе мы зняліся са спявачкай А. Чарняўскай», — прыгадвае ў «Лістках календара» Максім Танк (Максім Танк. Збор твораў у шасці тамах. Мн., 1981. Т.6. С. 203). Мне, на жаль, не ўдалося знайсці гэты фотаздымак.

Прыехаўшы ў Варшаву, Яўгенія Чарняўская-Орса разам з сябрамі мясцовага Асветнага таварыства беларусаў пачала збіраць фінансавыя сродкі на кнігу «Пад мачтай» Максіма Танка. Беларуская спявачка сабрала і перадала Максіму Танку каля 200 злотых. А рэштку грошай, неабходных на выданне зборніка, даў яшчэ адзін сябра «Таварыства сяброў навук». І 20 чэрвеня 1938 года зборнік вершаў «Пад мачтай» Максіма Танка выйшаў з друку.

Пасля заканчэння Варшаўскай кансерваторыі сляды беларускай спявачкі губляюцца. Альбо яна засталася ў Польшчы, альбо выехала далёка на Захад, альбо вярнулася на Радзіму. На вялікі жаль, імя яе не згадваецца ні ў адной беларускай энцыклапедыі.

ДАБРАЧЫННАСЦЬ

# ДАПАМАЖЫЦЕ МАЛЕНЬКАМУ ПЕЦЮ

**На партале Naviny.by з'явілася нататка пра чатырохгадовага Пецю, які пакутуе на рэдкае генетычнае захворванне — булёзны эпідэрмоліз.**



Кажучы прасцей, ад наймалога трэння скура сыходзіць з цела дзіцяці лапікамі. Адзінае, што хоць неяк можа палегчыць боль дзіцяці — штодзённыя перавязкі, якія доўжацца па 3 гадзіны. Сям'я не можа дазволіць сабе купляць кожны раз новыя перавязачныя матэрыялы, і таму ўжо скарыстаныя бінты мыюцца, сушацца і ідуць у справу зноў. Хвароба невылечная, але дзіцяці могуць дапамагчы ў Германіі. Для гэтага патрэбныя грошы. Дзякуючы дабрачыннай арганізацыі «Шанец» пачаўся збор прыватных ахвяраванняў на лячэнне малога. Трэба сабраць 17700 еўра, менш, чым каштуе лімузін кіраўніка Мінздрава Жаркова.

У любой нармальнай краіне гісторыя маленькага Пеці стала б падзеяй дня: міністра аховы здароўя проста разазвалі б на кавалкі за тое, што сям'я Пеці не забяспечана хоць бы бінтамі! Кіраўнік мясцовай адміністрацыі пасля такога матэрыялу да канца сваіх дзён не змог бы знайсці сабе пасаду вышэй за дворніка ці начнога вартаўніка. Пра гэта пісалі б, я ўпэўнены, усе выданні грамадска-палітычнай скіраванасці, і ў першую чаргу — апазіцыйныя.

Скажаце, цынічна выкарыстоўваць гора людскае ў палітычнай барацьбе? Так, цынічна. Але менавіта дзякуючы палітычнаму цынізму рэальнай, а не імітацыйнай барацьбы за ўладу, праблемы чалавека становяцца праблемай дзяржаўнага механізму. Калі маленькі чалавек не атрымае падтрымкі ад спадароў з высокіх кабінетаў, то ў гэтыя кабінеты заедуць іншыя, больш паваротлівыя і ўважлівыя да патрэб людзей. А старыя — пойдуць прэч. Зганьбаваныя, апляваныя грамадствам і нікому ніколі больш не цікавыя.

Ніводнае апазіцыйнае інтэрнэт-СМІ не зрабіла ласку хацяб перапасціць матэрыял з «Навін»! Замест гэтага чытачоў працягваюць шпігаваць прыдуркаватымі гісторыямі пра чарговы раўнд пошуку сэкстоту у шрагах беларускай апазіцыі, цешыць новымі коштамі на цыгарэты, палохаць злымі кітайцамі і распавядаць пра тое, што Еўропа пра нас не забылася.

Маленькі хлопчык, які кожны дзень мужна ўздымаецца на сваю Галгофу, апынуўся занадта маленькім, каб на яго звярнулі ўвагу.

**Пётр Андрэеў, для www.aljans.org (пераклад на беларускую мову «НЧ»)**

### ФОНД «ШАНЕЦ» ЗВЯРТАЕЦЦА ДА ДОБРЫХ ЛЮДЗЕЙ

«Дарагія дабрачынцы! Мы можам зрабіць для Пеці больш. У Расіі і Беларусі лячэння для такіх дзяцей няма. Пецю неабходна абследаванне ў Цэнтры эпідэрмолізу Універсітэцкай клінікі горада Фрайбург (Германія), які займаецца дзецьмі-матылькамі. Каб правесці абследаванне Пеці, падабраць лячэнне, неабходна сума 17 700 еўра». Засталося сабраць 16 846 еўра.

У першую чаргу будзе праведзены адмысловы генетычны аналіз, які дазволіць зразумець, які менавіта ген падпаў мутацыі. Пасля правядзення даследаванняў можна будзе зрабіць выснову пра агульны стан дзіцяці. Хлопчыка агледзяць тэрапеўт, акуліст, дэрматолаг, артапед, стаматолаг — бо пры булёзным эпідэрмолізе агляд і дапамога звычайных дзіцячых лекараў проста немагчымыя.

«Мы спадзяемся, лекары клінікі ўстановяць дакладны дыягназ і форму захворвання. А значыць, з'явіцца магчымасць забяспечыць правільны падыход: падабраць адмысловыя мазі і навучыць маму спосабам перавязкі і сістэме харчавання. Лячэнне дазволіць зменшыць болевыя адчуванні, значна падоўжыць і палепшыць якасць жыцця Пеці», — адзначае Тацццяна Жахоўская.

Адзначым, што фонд «Шанец» з'яўляецца некамерцыйнай арганізацыяй і не выкарыстоўвае сабраныя сродкі на пакрыццё адміністрацыйных выдаткаў. Сродкі, якія пералічваюцца на дабрачынны рахунак, паступаюць на лячэнне дзяцей.

**Рэквізіты для дабрачынных ахвяраванняў на лячэнне Пеці:** дабрачынны рахунак № 3135000000100 у ААТ «Белгазпромбанк», г. Мінск, код 742. Атрымальнік: Фонд «Шанец»; УНП 805001111. Прызначэнне плацяжу: ахвяраванне на лячэнне дзіцяці Надточага Пеці. Электроннымі грашыма EasyPay можна пералічыць сродкі на дабрачынны рахунак фонду, скарыстаўшыся аўтаматычнай формай аплаты на сайце фонду «Шанец».

Электронны кашалёк WebMoney у беларускіх рублях: B199756836033. Прызначэнне плацяжу: «ахвяраванне на лячэнне дзіцяці Надточага Пеці».

Аплатная сістэма інтэрнэт-банк.

Вы можаце пералічыць ахвяраванне з дапамогай пластыкавай банкаўскай карты VISA і MasterCard праз аплатную сістэму WebPay, скарыстаўшыся аўтаматычнай формай аплаты на сайце фонду «Шанец». Міжнародны перавод:

Банк-атрымальнік: Belgazprombank Minsk S. W. I. F. T.: OLMPBY2X, Minsk, Belarus. Атрымальнік: Фонд «Шанец», дабрачынны рахунак № 3135000000100 (у euro, расійскіх рублях, USD) Прызначэнне плацяжу: «ахвяраванне на лячэнне дзіцяці Надточага Пеці».

валюта: EUR

рахунак: 400886900000EUR

банк-карэспандэнт: Commerzbank AG, Frankfurt am Main, Germany

S. W. I. F. T.: COBA DE FF

валюта: RUB

рахунак: 30111810900000026155

банк-карэспандэнт: «ГПБ» (ААТ), Масква к/с «ГПБ» (ААТ) в ОПЕРУ МГТУ ЦБ РФ

№ 30101810200000000823 БИК 044525823 ИНН 7744001497

S. W. I. F. T.: GAZPRUMM

валюта: USD

рахунак: 3582023356001

банк-карэспандэнт: Standard Chartered Bank, New York

S. W. I. F. T.: SCBL US 33

КІНО

# ШТО ХАВАЮЦЬ НА ПОЎНІ?

**Андрэй РАСІНСКІ**

**У мінскіх кінатэатрах яшчэ ідзе нефарматная амерыканская кінафантастыка, спрадусаваная расіянінам Цімурам Бекмамбетавым «Апалон 18». Дзве з паловаю зорачкі з пяці.**



Тайная амерыканская экспедыцыя трапляе на Месяц. Там высвятляецца, што амерыканцы далёка не першыя. Але гэта яшчэ не самае непрыемнае. На зямным спадарожніку хаваецца нешта вельмі небяспечнае.

Фільм Гансала Лопеса-Гальега — халаднаватая вусцішная гісторыя, замаскаваная пад забытыя і знойдзеныя дакументы. Стылістыка фальшывай дакументальнасці з 60-х гадоў вабіла рэжысёраў. Менавіта ў гэтым стылі (ён яшчэ называецца «mockumentary») знятыя «Ведзьма з Блэр», «Монстра» і «Дзённікі мерцвякоў» Джорджа Рамэры.

Расійскі прадусар Цімур Бекмамбетаў дадаў у карціну тэму спаборніцтва ў «халоднай вайне» і гульню ў змовы. Як і мае быць у псеўдадакументальным кіно, на экране нешта дрыгаецца, хрыпіць, кадр размываецца, стужка падрапаная. Страхоцце стаілася дзесьці ў цемры, звыродлівыя чорныя плямы ці то ўяўляюцца, ці то поўзаюць перад камерамі. Касманаўты крычаць. Але фільм — вялы і нуднаваты, які вельмі доўга разгортваецца: да асноўнага дзеяння гледачы могуць проста не дасядзець. Фільм — добрае практыкаванне для рэжысёра, які здымае ў абмежаваных прасторах наўмысна састарэлай тэхнікай. Але не кожную тэхніку варта паказваць публіцы.

ДАБРАЧЫННАСЦЬ

# ЯНЫ ВАС ЧАКАЮЦЬ!

**Кот Цімафей жыве па прынцыпе «добрага ката павінна быць шмат».**



У яго пухлыя шчочкі і шыкоўны хвост, а сам Цімоша — вялікі і мяккі, з багатым дымчатым футрам. Гэты велікан у душы — трапяткі і сціплы, вельмі ласкавы. Цімафею 2 гады, ён цудоўна ходзіць у латочак, кастрыраваны. Не драпае шпалеры і мэблю. Ён вельмі любіць, калі яго чэшуць за вушкам, і тады голасна варкоча. Ён стане сябрам такому ж добраму і шчыраму гаспадару.

Калі ласка, тэлефануйце! 8-029 129-20-73 Марыя, 8-029 199-99-15 Юлія, 8-029 872-80-32 Алена

**Тася — гадавалая дзяўчушка-хахатушка.**

Гэта вельмі аптымістычны і ўсмешлівы сабака. Невялікія памеры (35 см) і добразычлівасць робяць Тасю ідэальным сабакам для кватэры. Яна ўжываецца з катамі і іншымі сабакамі. А яшчэ Тася — надзвычай ласкавая дзяўчынка, гатовая бясконца абдымацца і цалавацца. Забярыце Тасю ў свой утульны дом, і вы назаўсёды забудзеце пра самоту і нудоту.

Тэлефануйце, калі ласка, не пашкадуеце! 8-029-3138372 Ірэна



Усе пітомцы — у падарунак. Болей котак і сабак — у каталогах на www.forum.superkot.com

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 991

Падпісана да друку 23.09.2011. 8.00.

Наклад 7000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.